PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 31 (2464) Год XLVIII | Беласток, 3 жніўня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Падляшская статыстыка

28 ліпеня г.г. Статыстычная ўправа ў Беластоку абнародавала рапарт аб выніках мінулагодняга перапісу насельніцтва ў Падляшскім ваяводстве.

У межах сённяшняга ваяводства ў маі мінулага года пражывала 1 208,6 тысяч чалавек, што на 1,7% больш, чым на той жа тэрыторыі было ў 1988 годзе. Наша насельніцтва пастарэла: на 95 тысяч пабольшаў лік асоб ва ўзросце 15 гадоў і старэйшым, а на 75,2 тысячы паменшаў лік дзяцей да 15 гадоў. У мінулым годзе дзеці і моладзь да 17 гадоў складалі 24,7% насельніцтва Падляшскага ваяводства, калі 14 гадоў раней было іх 30,4% на той жа тэрыторыі. Адсотак гарадскога насельніцтва пабольшаў з 54,1% да 58,9%. У Беластоку пражывала 291,4 тысяч чалавек, Сямятычах — 15,3 тыс., Саколцы — 19,2 тыс., Гайнаўцы — 22,5 тыс., Бельску — 27,1 тыс., Дуброве — 6,3 тыс., Кляшчэлях — 1,5 тыс., Заблудаве — 2,4 тысячы. Найменш людная гмінай была Дубіцкая гміна — 2,1 тысячы жыхароў.

У Падляшскім ваяводстве пражывала 471,4 тысячы мужчын і 503,6 тысячы жанчын. Мужчын больш ва ўзроставай групе да трыццаці гадоў, напр. на 56 тысяч хлопцаў да 19 гадоў выпадае толькі 53,1 тысячы дзяўчат, ва ўзросце 20-24 гадоў — адпаведна 48,2 тыс. і 45,1 тыс., 25-29 гадоў — 44 тыс. і 42 тысячы. У разрадзе 30-59 гадоў можна заўважыць парытэт, але ўжо старэйшых астаецца 90,7 тыс. мужчын і аж 129,7 тыс. жанчын.

Польскую нацыянальнасць назвала сваёй 1135,3 тысячы чалавек (93,9%), іншую чым польская — 55,2 тыс. (4,6%) а 18,1 тысячы не ўдалося ўстанавіць нацыянальнасці, галоўным чынам з-за адсутнасці адказу. У Падляшскім ваяводстве пражывала 46,4 тысячы беларусаў, 5,2 тыс. літоўцаў, 1,4 тыс. украінцаў, 0,6 тыс. расейцаў і 0,4 тыс. ромаў.

Польскай мовай карысталася дома 1178,7 тысячы асоб, з гэтага ліку выключна польскай мовай — 1134,3 тысячы. Іншымі чым польская мовамі карысталася 56,2 тысячы чалавек, з гэтага ліку ўперамешку з польскай мовай — 44,3 тысячы. Выключна іншымі чым польская мовамі карысталася дома 11,9 тысячы асоб. Васемнаццаці тысячам чалавек немагчыма было ўстанавіць мову дамашняга карыстання. Чатыры „няпольскія" мовы дамашняй камунікацыі назвала па больш чым тысячы асоб; найбольш беларускую — 39,9 тыс. і літоўскую — 5,4 тысячы.

Прыведзеныя даныя — дынамічныя, яны змяняюцца з ходам часу. За больш чым год ад перапісу большасць гэтых лікаў займела новыя вартасці. А які будзе краявід пасля чарговага перапісу? Пажывем, пабачым...

Аляксандр Вярбіцкі

Фота Ганны Кандрацюк

XIV Фестываль музыкі Маладой Беларусі „Басовішча 2003"

Як добра змазаная машына

Мікола Ваўранюк

... два дні — 18 і 19 ліпеня — кацілася „Басовішча". Без ніякага скрыгату, прэтэнзій навічкоў да старых, зорак з Беларусі да польскіх, усіх разам і кожнага паасобку да арганізатараў. Былі добрыя гук і святло, і нарэшце ўсе кабелі на сваім месцы. Нават надвор'е спрыяла беларускай справе. А калі сонца спрыяла аж надта, на месцы аказаліся пажарнікі і палілі вадою пыл ды гарачыя галовы гульцоў.

Самым моцным момантам сёлетняга Фестывалю быў канцэрт „Neuro Dubel". Звышгадзінны шоу на сцэне даў асалоду тысячам ва ўсім Барыку, а сотні пад сцэнай кінуў у транс. Не расчараваў і „H.P.M.", які публіка тры разы вяртала на біс, хаця была ўжо трэцяя гадзіна святой нядзелькі. А людзям было ўсё мала і мала!

Публіка не падвяла ў два вечары. Калі раней ролю магніта для маладых людзей выконвала польская зорка, дык апошні Фестываль даказаў, што і беларускія гурты ў нас маюць сваіх верных фанатаў. Арганізатары ўпершыню рашылі паставіць польскіх гасцей не ў суботу, а ў пятніцу. І што? Нічога. Свет не заваліўся, суботні канцэрт не сарваўся, а нават людзей сабралася больш, чым у пятніцу. Іншая справа, што сёлетняя польская зорка — панкавая група „Cool Kids of Death" — хаця іграць умее, на фоне беларускіх рокераў не ашаламіла. Арганізатары будучых „Басовішчаў" павінны ўзяць сёлетні досвед пад развагу. Могуць зэканоміць трохі граша.

На фоне роўнага добрага канцэрта былі і лёгкія расчараванні. „Zero-85" пачаў моцна — саліст Юрка Асеннік парваў на сабе кашулю. І тым самым, нібы прабіў у гурце дзіру, якою стала сходзіць паветра. Усё было яго менш і менш. Зрабілася нуднавата. Гэтай манатоннасці не перабіў і „Уліс", які зайграў на сваім узроўні.

А „Рыма" пачала шукаць новую паэтыку не там дзе трэба. Можа маладым людзям і лягчэй думаць па-польску, але гэта не значыць, што тыя думкі адразу атрымаюцца бліскучымі. Такія, здавалася б, натуральна паэтычныя выразы, як *nie odchodź z wiatrem*, вельмі ўжо нагадваюць — карыстаючыся жывапіснай метафарай — аленя на ўскраіне лесу на зыходзе сонца.

* * *

У конкурсе прынялі ўдзел адзінаццаць гуртоў. Маім фаварытам быў „Тэзаўрус" з Мінска. І то ад першай песні „Дрыгва". Чыстая рытмічная музыка, дастроеныя інструменты як дапаможнік салісту, а не яго заглушальнік, цікавыя паводзіны на сцэне, на жаль, не знайшлі такога ж прызнання ў вачах і вушах журы. Камісія — Слава Корань, Вітаўт Мартыненка, Аляксандр Памідораў і Лукаш Сцепанюк — іначай размеркавала пяць узнагарод. Ажно дзве трапіліся гурту „Індыга" з Мінска: прэмія Беларускага саюза ў Рэчы Паспалітай і 20 гадзін запісу ў студыі Беластоцкага радыё. Гэтае рашэнне мне асабі-

[працяг ☞ 3]

Зачыстка... ☞ 2

„Ратушу" ўсё роўна ліквідуюць, — лічыць яе старшыня Аляксандр Мілінкевіч, — і нам прыйдзецца перайсці на іншыя метады працы. Грамадскае аб'яднанне „Ратуша" на сённяшні дзень з'яўляецца адным з самых буйных на Гродзеншчыне цэнтраў падтрымкі грамадскіх арганізацый.

Завітала ўлада ☞ 4

Слухайце, людкове, справа нечуваная — падляшская ўлада завітала да пісьменніка дахаты, да Сакрата Яновіча. Больш таго, не так сабе заехала ў Крынкі і асабіста застукала ў дзверы, але раней накіравала пісьмовую просьбу сустрэцца. У рамках падрыхтоўкі прадстаўнік нават пазваніў у рэдакцыю „Нівы": — Czy mogę się dowiedzieć, co napisał Sokrat Janowicz?

Канцэрт меншасцей ☞ 8

Польскія песні мілагучна і з вялікім пачуццём спявалі калектывы з Гродзеншчыны, між іншым, „Вішанька" з Путрышкоўскага дома культуры, вакальная група са Струбніцкага дома культуры, „Анджэліка" з Ліды, „Шкляры" з Бярозаўкі, „Польскія кветкі" з Астравецкага раёна і „Іўянка" з Іўя.

За ідэалы ў будучыні ☞ 9

У барацьбе за праўдзівую гісторыю Бацькаўшчыны праявіў сапраўдны волатаўскі дух, быў паслядоўны і бескампрамісны, — піша пра Ермаловіча гісторык Анатоль Грыцкевіч. — Ён не пабаяўся пагрозы і з боку адпаведных органаў, дзе яму няраз прапанавалі спыніць „свае пісанні".

Саветы паказвалі фільмы ☞ 10

Саветаў віталі ў Крынках, жыды і нашыя кветкі ім кідалі. Калі савецкая калона праходзіла праз нашу вёску на захад, то адзін наш вясковец іх вітаў; было гэта тады, калі бульбу выбіралі. Савецкае войска спынілася на некалькі дзён каля нашай вёскі. На адну стадолу палатно начапілі і фільмы паказвалі — уся вёска хадзіла глядзець.

Сенакос у Студзіводах ☞ 11

У „Паэтычным сенакосе" арганізаваным 28 чэрвеня 2003 года ў Студзіводах прынялі ўдзел народныя творцы. Сярод іх былі беларускія народныя паэткі Вольга Анацік і Марыя Манаховіч з Ягуштова. Свае мастацкія працы прэзентаваў Анатоль Краўчук з Крывой.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Зачыстка перад новым 37-м годам

„Ратушу" ўсё роўна ліквідуюць, — лічыць яе старшыня Аляксандр Мілінкевіч, — і нам давядзецца перайсці на іншыя метады працы.

Гэтую думку ён выказаў пасля таго, як суд Ленінскага раёна Гродна пакінуў у сіле рашэнне адміністратыўнай камісіі Ленінскага раёна. У сваім рашэнні гэтая камісія наклала на спадара Мілінкевіча штраф у памеры аднаго мінімальнага заробку за няправільнае захаванне і карыстанне паліграфічным апаратам — рызографам.

У час суда спадар Мілінкевіч і ягоны прадстаўнік Уладзімір Лабковіч спрабавалі абараніць падставовыя правы чалавека. Гэтыя правы заключаліся ў тым, што ў час вынясення рашэння адміністратыўнай камісіяй Ленінскага раёна Гродна Мілінкевіч адсутнічаў і прысуд вынеслі без яго. А таксама саму пастанову пра тое, што павінна адбывацца адміністратыўная камісія — Мілінкевіч атрымаў ужо пасля таго, як гэтая камісія адбылася.

Справа Гродзенскага грамадскага аб'яднання „Ратуша" пачалася яшчэ 21 красавіка, калі ўпраўленне юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама накіравала ў Гродзенскі абласны суд спазыск аб ліквідацыі Гродзенскага абласнога грамадскага аб'яднання „Ратуша". Падставай для закрыцця „Ратушы" сталі два папярэджанні, якія арганізацыя атрымала цягам года.

Адразу пасля таго, як пачаўся фактычны „наезд" на арганізацыю з боку дзяржавы, міжнародныя і беларускія няўрадавыя арганізацыі накіравалі свае пратэсты ў гэтай справе.

15 мая Гродзенскі універсітэт адмовіўся ўзяць на свой баланс рызограф, з-за якога і пачаўся працэс ліквідацыі грамадскага аб'яднання. 22 мая над „Ратушай" распачаўся суд у абласным судзе Гродна, які цягнуўся толькі адзін дзень і быў перапынены толькі з-за таго, што ў Ленінскім судзе — судзе ніжэйшай інстанцыі — павінна было адбыцца пасяджэнне, на якім павінна была разглядацца скарга старшыні арганізацыі А. Мілінкевіча па пытанні накладзенага на яго штрафу па карыстанні рызографам. Калі адбудзецца наступнае судовае пасяджэнне па ліквідацыі „Ратушы" стане вядома на працягу бліжэйшага тыдня-двух.

Грамадскае аб'яднанне „Ратуша" на сённяшні дзень з'яўляецца адным з самых буйных на Гродзеншчыне цэнтраў падтрымкі грамадскіх арганізацый. У памяшканні „Ратушы" прадстаўнікі іншых грамадскіх арганізацый праводзяць сустрэчы і канферэнцыі, маюць магчымасць карыстацца камп'ютэрамі і Інтэрнэтам. Карыстанне Інтэрнэтам у „Ратушы" ажыццяўляецца згодна міжнароднаму праекту „Інтэрнэт для НДА", які рэалізуецца Праграмай Развіцця ААН у Беларусі.

„Ратуша" — не першая арганізацыя, якой пагражае закрыццё. Літаральна некалькі дзён назад было закрыта рэспубліканскае аб'яднанне МХСС, чакае свайго закрыцця яшчэ адна арганізацыя ў Гомелі — „Грамадскія ініцыятывы", якая профілем сваёй дзейнасці нагадвае „Ратушу".

Як сцвярджаюць вядомыя ў Беларусі і на Гродзеншчыне палітыкі ды грамадскія дзеячы, у краіне праходзіць „зачыстка", ці то перад маючым адбыцца рэферэндумам, ці то новым тэрмінам прэзідэнцтва.

Апроч гэтага мінская газета „Наша Ніва" паведаміла, што камітэт дзяржкантролю Беларусі атрымаў права на падслухоўванне тэлефонаў і памяшканняў, на чытанне звычайнай і электроннай пошты. На сённяшні дзень, як паведамляе газета, гэтым правам могуць карыстацца восем структур: органы ўнутраных спраў, дзяржбяспекі, памежныя войскі, служба бяспекі прэзідэнта, мытныя органы, органы замежнай выведкі і камітэт дзяржкантролю.

Андрэй Мялешка

Перадрэферэндумны пералрус

Самай гучнай сёлетняй падзеяй у Беларусі можна назваць адстаўку ўрада. Дакладней — прэм'ер-міністра Генадзя Навіцкага і некалькіх высокіх чыноўнікаў сельскагаспадарчага сектара. Афіцыйнай нагодай для такіх дзеянняў з боку Аляксандра Лукашэнкі, бо гэта ягоная ініцыятыва, была нявыплата запазычанасцей па зарплаце сялянам і фальсіфікацыі статыстычных даных. Такім чынам, па словах прэзідэнта, уся прычына ўрадавай чысткі выключна эканамічная, бо цяпер, маўляў, у яго няма перакананасці, што ўрад пад кіраўніцтвам Г. Навіцкага будзе „эфектыўным эканамічным штабам". Аднак шэраг падзей унутрыпалітычнага жыцця Беларусі паказвае на тое, што такое абгрунтаванне „разгону" ўрада не адпавядае рэчаіснасці.

За гады прэзідэнцтва А. Лукашэнкі ў адстаўку пайшлі чатыры кіраўнікі ўрада. Першы — Міхаіл Чыгір — па сваёй ініцыятыве ў 1996 годзе, з-за разыходжанняў з палітыкай прэзідэнта, якія ярка выявіліся ў час правядзення лістападаўскага рэферэндуму па зменах у канстытуцыю. Двух наступных — Сяргей Лінг і Уладзімір Ярмошын, за сваю прэм'ерскую дзейнасць атрымалі падзякі і спакойна перайшлі займацца іншымі справамі. Прызначаны ў кастрычніку 2001 г. Генадзь Навіцкі, у мінулым міністр архітэктуры і будаўніцтва, стаў першым кіраўніком урада, якога „здзьмуў" з пасады прэзідэнцкі гнеў. Але самае цікавае, што і гневацца А. Лукашэнку з эканамічнага пункту гледжання на назначаны сабою ўрад не было чаго.

Вось чаму. Нявыплата заробку сялянам, а калі дакладней і пры дапамозе савецкай тэрміналогіі — працоўнаму класу на сяле, стала на працягу апошніх гадоў хранічнай хваробай. І тыя лічбы запазычанасцей, ад даўгоў гандлёвых прадпрыемстваў перапрацоўшчыкам сельгаспрадукцыі — 40 млрд. рублёў (20 млн. долараў), да неатрымаўшых заробак калгаснікаў (6,3 млн. долараў), не такія ўжо і вялікія ў параўнанні, напрыклад, з леташнімі — 100 млрд. рублёў (каля 45 млн. долараў). Але тады нагоды мяняць трацiну ўрада, што паабяцаў зрабіць цягам ліпеня беларускі прэзідэнт, аказваецца, не было.

У той жа час, па сведчаннях апазіцыйных палітыкаў, лукашэнкаўскае кіраўніцтва ўзяло курс на падрыхтоўку і правядзенне чарговага рэферэндуму, мэтай якога — унясенне змен у беларускую канстытуцыю, якія дазволяць бесперапынна абірацца больш за два разы адной асобе на прэзідэнцкую пасаду. Зразумела, тычыцца гэта цяперашняга кіраўніка Беларусі, які, праўдападобна, не ўяўляе сябе па-за вышэйшай уладай і лічыць сябе асобай, для якой няма замены.

Цікава, што для ўзмацнення паслухмянасці вышэйшага і ніжэйшага чынавенства абраны „пернік", хаця, на першы погляд, беларуская грамадскасць тры дні запар чула свіст „біча". Адпраўленых у адстаўку вышэйшых чыноўнікаў, нягледзячы на тое, што яны „фальсіфікавалі факты", ні ў якім разе нельга лічыць ворагамі або дрэннымі работнікамі. Усіх іх А. Лукашэнка паабяцаў добра працаўладкаваць. Так, звольнены віцэ-прэм'ер Аляксандр Папкоў мог бы кіраваць рэспубліканскім фестывалем „Дажынкі". Калі ўлічыць, што падобныя разгоны закранулі таксама і ніжэйшыя — абласныя і раённыя — узроўні выканаўчай улады, прыходзіш да высновы, што іхняй мэтай ёсць звычайная пералусоўка „кадравай калоды", што само сабой адкрывае магчымасць ніжэйшым чыноўнікам хуценька караскацца па службовай лесвіцы, займаючы пасады адстаўленых. Зразумела, усяго гэтага можна дабіцца пры адпаведнай асабістай адданасці найвышэйшаму кіраўніцтву. А найлепшым часам для гэтага будзе падрыхтоўка і правядзенне згаданага рэферэндуму. Тым больш, што па сацыялагічных даследаваннях рэйтынг папулярнасці А. Лукашэнкі ў апошнія месяцы надзвычай нізкі.

Калі ж узяць пад увагу, што выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра былы віцэ-прэм'ер Сяргей Сідорскі лічыцца чалавекам вельмі жорсткім у параўнанні з „мяккім" Навіцкім, то перад беларускім чынавенствам неспакойнае жыццё. Па меншай меры, да канца гэтага — пачатку наступнага года, у перыяд, у які палітолагі прарочаць правядзенне рэферэндуму.

Адхіляючы ад пасад вышэйшых чыноўнікаў А. Лукашэнка завіў, што „народу такая ўлада непатрэбная". Але ж такую ўладу, а дакладней урад, прызначаў не народ, а асабіста прэзідэнт, бо гэта менавіта ў яго кампетэнцыі.

Дык якая ж урэшце ўлада непатрэбная беларускаму народу?

Уладзімір Лапцэвіч

Фота Пётры Сакольчыка

На Грунвальдскім полі

Штогод на Грунвальдскім полі адбываецца рэканструкцыя найвялікшай бітвы 1410 года, што збірае пад 90 тысяч гледачоў і прыблізна паўтары тысячы братоў-рыцараў у сярэднявечных узбраеннях і строях са шматлікіх рыцарскіх брацтваў і клубаў гістарычнай рэканструкцыі з усёй Польшчы і Беларусі, а таксама некалькі з іншых краёў — Італіі, Летувы ды Чэхаў.

Бітва 1410 года (якую ў гістарычных крыніцах падаюць таксама пад назваю Бітва пад Дуброўнай ці Стэнбаркам) была паваротным момантам у барацьбе Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага з Законам крыжацкім — тэўтонамі, што доўжылася практычна паўстагоддзя 1386-1435. Да 1409 года ўзброеная барацьба абодвух бакоў адбывалася на Жмудзі, чаргуючыся з адбіццём нападаў на Вялікае княства Літоўскае. Па 1409 годзе абедзве памежныя дзяржавы — КП і ВКЛ — вялі бітвы з крыжакамі — крывавыя і афіцыйныя, бо палітычная барацьба мела ўжо шырокі міжнародны розгалас.

Сярод удзельнікаў рэканструкцыі з Беларусі — канфедэрацыя „Рыцары Вялікага княства Літоўскага" і клубы „Паўночнага Храма", „Калюмны", „Рыцары Вялікага Княства" ды іншыя. Пад час імпрэзаў на Грунвальдскім полі ў 2000-2002 гг. найбольш цікавыя моманты фіксаваліся на фотастужку і паводле іх быў створаны сайт на беларускай мове ў Інтэрнэце, прысвечаны бітве <http://grunwald.iatp.by> , дзе ўзгадваюцца асноўныя падзеі 1409-1410 гадоў. Запрашаем зрабіць цікавае віртуальнае падарожжа.

Пётра Сакольчык

Як добра змазаная машына

[1 ☞ працяг]

ста не зусім даспадобы. Да астатніх не маю засцярог. Берасцейскай „Сцяне" трапіўся прыз Беларускай рэдакцыі Пятай праграмы Польскага радыё ў Варшаве. Узнагарода Беларускага аб'яднання студэнтаў — мінскаму гурту „IQ 48", а войта Гарадоцкай гміны — камандзе „TRIQUETRA" з Аструды.

Гэты апошні трапіў у Гарадок праз Познань. Польскіх студэнтаў тамтэйшых вышэйшых школ паспяхова „беларусізаваў" Віталь Воранаў. Малады эмігрант з Беларусі пераклаў сябрам-палякам іхнія песні на беларускую мову. Ім такое далучэнне да беларускай культуры спадабалася. Публіцы ў падгарадоцкім Барыку — таксама.

„Сцяна" ўзнікла ў 1999 годзе, — як самі сябры гурту кажуць, — ад чыстага захаплення музыкай. Потым пачалася сур'ёзная праца, пайшлі канцэрты. Паслядоўнасць і прывяла гурт з Берасця, які вылучаецца двума саксафонамі, да ўзнагароды на „Басовішчы".

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— Назва „IQ 48" з'явілася пасля таго, як мы ва універсітэце праходзілі заняткі па псіхалогіі, — тлумачыць оФрэйд, саліст гурту. — Людзі, у якіх IQ 48, звычайна вясёлыя, не маюць праблем, бо і ў галаве нічога не маюць. Мы на сцэне хочам быць такімі ж вясёлымі, бестурботнымі, іграць радасную, пазітыўную музыку.

„IQ 48" быў заснаваны год таму ў Мінску. Узнагарода, гэта для яго шанц на запіс некалькіх песень у прафесійнай студыі. Да гэтай пары ў іх толькі тры запісаныя творы. На больш не хапіла грошай.

* * *

— Гэтае месца, ужо частка гісторыі, — сказаў Піт Паўлаў, гітарыст „H.P.M." — беларускі *Woodstock*. Ніводзін з фестываляў, арганізаваных у Беларусі не адыграў такой ролі ў развіцці рок-музыкі, ніводзін не пратрымаўся так доўга.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— Мы ў свой час, у 1988-90 гадах сарганізавалі ў Гродне тры рок-фестывалі, — прыпомніў Мікола Таранда, тады кіраўнік клуба „Паходня". — На тым усё і закончылася. Таму я радуюся, што „Басовішча" развіваецца, прыцягвае ўсё больш беларускай моладзі. Калісьці адна наша паэтка старэйшага пакалення напісала мне ў лісце, што рок-музыканты зробяць больш для беларускай справы, чымсьці ўсе надзьмутыя і пустыя афіцыйныя пасядзелкі.

Прароцтва спраўдзілася. Аўтобусы з Беларусі з музыкамі і іхнімі фанатамі, быццам за справай цудадзейнай палачкі, на мяжы ў Бабруйніках напаўняюцца беларускай гамонкай. Людзі, якія ўсё жыццё карысталіся рускай мовай, раптам знаходзяць матывіроўку пераключыцца на беларускую. Іншы доказ на праўдзівасць прароцтва старой паэткі — з нашага панадворка. На Беласточчыне вырасла пакаленне, якое не ўяўляе сабе ліпеня без гарадоцкага фестывалю.

„Басовішча" падабаецца амаль усім, хто на ім пабываў. Адны высока ацэньваюць яго ролю ў фармаванні нацыянальнай свядомасці беларускай моладзі, іншыя — значэнне для развіцця беларускай рок-музыкі, яшчэ іншыя — яднанне беларускай і польскай моладзі. Першыя, другія і трэція падкрэсліваюць непрымушаную добрую атмасферу імпрэзы. У Барыку побач дваццацігодкаў добра гуляюць сённяшнія саракагодкі — тыя, хто стаяў ля вытокаў Фестывалю.

Цікава, што словы наракання, маўляў, гэтая занадта гучная музыка ўжо не мая, пачуў я ад трыццацігодкаў. Умоўна кажучы — пакаленне Звяза беларускай моладзі, якое свежа абзавялося сем'ямі. І калі яно так пастарэла?

Мікола Ваўранюк

Пчалярства — карысны занятак

Мяркуецца, што чалавек пачаў выкарыстоўваць пчол 9-10 тысяч гадоў таму. Самы старажытны спосаб здабывання мёду і воску зводзіўся да палявання на заселеныя меданоснымі пчоламі дуплы дрэў і ў выніку — да знішчэння пчаліных гнёздаў. Пазней людзі сталі даглядаць пчол у дуплах, а затым разводзіць іх у штучных дуплах — борцях. Бортніцтва пашыралася ў X-XVII стагоддзях. У XVIII ст. змянілася яно пчалярствам калодным, калі пчол сталі разводзіць у неразборных перасоўных калодах і дуплянках. З 1814 г. развіваецца рамачнае пчалярства.

Пчаліная сям'я — структура трывалая, складзеная з некалькіх тысяч рабочых пчол, маткі і трутняў. Матка жыве доўга (2-3 гады) і адкладвае да 3 тысяч яец у суткі. Ранняй вясною рабочыя пчолы (жывуць 35-40 дзён летам і 6-8 месяцаў увосень і зімою) масава вылятаюць за нектарам і пылком.

— Вясною маладыя пчолы робяць пробны палёт, — расказвае Аляксей Кубаеўскі з Орлі, які пчалаводствам займаецца ўжо гадоў сорак. — Трымаю некалькі вулеяў, бо панадворак у мяне невялікі, а ў суседкі павышаная рэактыўнасць на пчаліны яд...

Пчолам, тлумачыць арлянскі пчаляр, характэрны высока развіты інстынкт абароны свайго гнязда, таму ўмела трэба сябе паводзіць, правяраць вулей у адпаведны час, асцерагацца гвалтоўных рухаў, насіць галаўны убор, каб пчолы не заблыталіся ў валасы. Асаблівую схільнасць да джалення пчолы праяўляюць перад бурай.

— Працую без рукавіц, бяру спакойна пчол у рукі. Але калісь натрапіў я на агрэсіўную матку і цэлы рой абсеў мяне і стаў джаліць цераз вопратку. Я стаў уцякаць дахаты і па дарозе... распранацца. Калі ўбег у хату, то пчолы сталі джаліць жонку, — смяецца Аляксей Кубаеўскі. — Цяпер я ўстойлівы на пчаліны яд, але раней адразу пачынаў пухнуць.

Да пчалінага мёду намагаюцца дайсці розныя насякомыя. І так, чмяля пчолы сумеюць прагнаць, будуць змагацца з асой, але шэршням здаюцца. Калі прыляціць некалькі шэршняў, знішчаць пчаліную сям'ю ў адну хвіліну.

Аляксей Кубаеўскі калісьці быў членам Пчалярскага саюза, удзельнічаў у курсах і абучэннях. Пчалаводам стаў зусім выпадкова. Калі працаваў на цагельні, у дрэве, якое прымянялася для выпальвання керамікі, угняздзіўся пчаліны рой. Трэба было яго прыбраць, але не было ахвотных і смелых заняцца пчоламі. Разам са сваім братам загрузіў рой у мяшок і тры кіламетры вёз яго на ровары дадому. Пазней у Быдгаскім пчалаводчым інстытуце заказаў па пошце каўказскую пароду. Пчалярству вучыўся ён па кніжках, а цяпер людзі вучацца ў яго.

— Самы радасны момант у пчалаводстве — уборка мёду, — прызнаецца пчалавод. — Калі добры год, можна падбіраць мёд некалькі разоў. Асноўны сырэц для вытворчасці мёду — нектар (цукрыстая вадкасць, сакрэт нектарнікаў кветкавых раслін) і падзь (салодкае рэчыва, якое выступае на лісцях дрэў і елак). Мёд падбіраю толькі з надставак, а ў гнёздах пакідаю. У красавіку пчолы найбольш пылку збіраюць з казінай вярбы (брэдніку). Тады абмінаюць бярозу, таполю ці альшыну. Улетку збіраюць пылок з ліпы, акацыі, каштана, а восенню — з верасу. Калі пасека знаходзіцца паблізу лесу, мёд набудзе цёмназялёны колер.

Важным кампанентам пчалінага корму з'яўляецца вада. Найбольш вады патрэба пчалінай сям'і ў перыяд адкладання маткай яец. На пчальніку неабходна тады мець цякучую ваду, напрыклад, вядро з лёгка адкрытым кранам. Найлепшае месца на пасеку — наваколле лугоў, мешаных лясоў, садоў, у суседстве ліп або акацый. Вулеі павінны знаходзіцца за агароджаю, у сонечным, заслоненым ад ветру месцы.

— Пасля зімы агляд пчаліных гнёздаў неабходна рабіць двойчы. Потым кароткі агляд у канцы сакавіка або ў пачатку красавіка. Трохі пазней трэба выканаць яшчэ адзін дакладны агляд. На зіму вулеі неабходна ацяпляць. Я прымяняю для гэтага саламяныя маты абшытыя палатном. Нельга ўжываць сена і шмоцця, бо ад гэтага бярэцца цвіль. Пчолы — цікавая справа, — з радасцю аб сваім карысным хобі заяўляе Аляксей Кубаеўскі.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Кветкі на балоце

Канікулы ў Беластоку бываюць не надта прыемнымі, але ёсць нагода бліжэй пазнаёміцца з ваколіцай, у якой чалавек жыве. У наш час, калі ўсе заняты ўсялякімі нібыта важнымі справамі, няма часу прыглянуцца, што адбываецца навокал. Часамі на працягу некалькіх гадоў няма ў чалавека часу пазнаёміцца са сваім суседам, які, дарэчы, таксама заняты такімі ж важнымі справамі.

Вельмі цяжка цяпер заўважыць мяжу паміж горадам Беластокам і вёскай Засцянкі. Вуліца Баранавіцкая пачынаецца 4 кіламетры ад цэнтра Беластока, канчаецца ў гміне Супрасль і спалучае з горадам, апрача ўспомненых Засцянкаў, Грабоўку і Сабалева. Далей дарога вядзе проста да мяжы з Беларуссю. У кожнай з вёсак — Засцянкі, Грабоўка і Сабалева — некалькі дзесяткаў вуліц. Некаторыя вуліцы гэта ў сапраўднасці лясныя сцежкі, вакол якіх вырастаюць у кустоўі невялікія палацы. Часам ад палявой дарожкі адыходзіць у лес амаль праспект з вулічным асвятленнем. На адным з лясных катэджаў можна заўважыць сонечныя батарэі, а басейн на панадворку хутка стане нормай.

Вёскі, якія раскінуліся вакол Беластока, а ў якіх раней каля крамы сядзелі толькі мясцовыя п'яніцы, пераўтвараюцца ў кварталы горада. Хаця па бліжэй невядомых прычынах гэта гміна Супрасль, але ў Супрасль людзі едуць праз Беласток толькі ў выпадку неабходнасці — аформіць нейкія адміністрацыйныя справы.

Палі, на якіх раней мясцовыя сеялі жыта і авёс, пераўтварыліся цяпер у прыбытковы тавар — вартасцю ў 15-20 долараў за квадратны метр. Нават у мясцовага беспрацоўнага пралетарыяту няма калі пасядзець каля крамы, бо на шматлікіх будовах патрабуюць кожнага, хто ў змозе трымаць у руках малаток. Ад 6 раніцы на мясцовых дарожках можна сустрэць сотні маладых людзей на веласіпедах, пехатою, у моцна запэцканай фарбай, цэментам, вапнай і чым там яшчэ вопратцы, якія спехам падаюцца ў месцы сваёй працы. З цэнтра Беластока ў напрамку названых вёсак выцякае ручай усялякіх „майстроў". Гэтыя, у адрозненне ад мясцовых, едуць найчасцей „паланезамі", „фіатамі", дваццацігадовымі „опелямі", „фольксвагенамі", „фордамі". Па вуліцы Баранавіцкай, на беластоцкім яе адрэзку, дзве вялікія крамы з усімі будаўнічымі матэрыяламі. На адрэзку паміж Засцянкамі і Грабоўкай — тры такія крамы. Каб нешта ў іх купіць, неабавязкова мець пры сабе грошы ці нават ісці ў саму краму. Можна патэлефанаваць з хаты і заказаць матэрыял хаця б і на ўвесь дом. Яшчэ ў той жа дзень увесь заказ будзе пастаўлены на месца. Транспарт атрымаецца дарма.

На пясчаных або балоцістых палях вакол названых вёсак вырастае казачны свет. Вялікі выбар будаўнічых матэрыялаў дае магчымасць стварыць сапраўдныя творы мастацтва. Ідзе тут не толькі пра архітэктуру будынкаў (паводле праектаў з Інтэрнэт-каталогаў), але перш за ўсё пра кампазіцыю акружэння дома. Праектанты на плошчы ў тысячу квадратных метраў ствараюць сапраўдныя паркі. Іх выканаўцы — спецыялісты па гідратэхніцы, біятоніцы, геадэзіі. Часам некалькі творчых калектываў працуе над эстэтыкай гэтага акружэння. Каменная мазаіка, па якой сваім аўтамабілем едзе ўласнік аднаго такога палаца, раўнацэнная трохпакаёвай кватэры ў цэнтры горада.

Раней паводле такой філасофіі жылі магнаты — Радзівілы ў Нясвіжы, Агінскія ў Слоніме, Браніцкія ў Беластоку. Сёння, у меншым маштабе, гэта выпала на долю звычайных плебеяў — уласнікаў крамаў, пякарняў, вытворцаў пластмасавых упаковак, туалетнай паперы. Кожны, хто ў нашым капіталізме паварушыў рукамі і мазгамі ды меў трохі шчасця, мог распараджацца не меншым за карумпаваных палітыкаў капіталам. Гэтыя палацы, якія вырастаюць вакол Беластока, падказваюць таксама, дзе і як беспрацоўныя зарабляюць на сваё выжыванне. Некаторыя з іх прыязджаюць на працу лепшымі за сваіх працадаўцаў аўтамабілямі. І ў гэтым заключаецца прыгажосць капіталізму ў посткамуністычнай дзяржаве.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Завітала ўлада

Слухайце, людкове, справа нечуваная — падляшская ўлада завітала да пісьменніка дахаты, да Сакрата Яновіча. Больш таго, не так сабе заехала ў Крынкі і асабіста застукала ў дзверы, але раней падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі накіраваў пісьмовую просьбу сустрэцца. „Хацеў бы я наведаць Вас у Villi Sokrates ды паразмаўляць аб літаратуры і аб людзях, аб нашай рэгіянальнай супольнасці, паслухаць на гэтую тэму Вашых асабістых думак". Гэтае, здавалася б, асабістае прызнанне маршалка апынулася ў Інтэрнэце на старонцы Падляшскай маршалкоўскай управы, значыць, як кажуць члены сеймавай следчай камісіі ў справе Рывіна — стала *publiczną domeną*. У Вілу Сакрата, апрача маршалка Кшыжэўскага, завітаў таксама старшыня ваяводскага сейміка Збігнеў Кшывіцкі ды двух ніжэйшых чыноўнікаў. Было гэта ледзь не месяц пасля таго, як прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі ўручыў Сакрату Яновічу ўзнагароду імя Анджэя Дравіча. Ад віншаванняў з гэтай нагоды высокія госці пачалі візіт. Як чуваць у народзе, калі б не тая ўзнагарода, да сустрэчы, пэўна, не дайшло б, ну, хіба што сам Сакрат Яновіч быў бы ў патрэбе і сам выбраўся ў тую ўстанову. Згодна з афіцыйным камунікатам, „rozmowa z artystą była dla wszystkich gości prawdziwą przyjemnością. Przeplatana humorem i dowcipami, **acz** celnymi uwagami pisarza dotyczyła nie tylko literatury. Mówiono o historii obu narodów, polskiego i białoruskiego, o ziemi na której oba narody wspólnie żyją". Можна паверыць зместу таго камуніката, бо самаўрадавая падляшская ўлада падрыхтавалася да гэтай сустрэчы. У рамках падрыхтоўкі прадстаўнік нават пазваніў у рэдакцыю „Нівы": — Czy mogę się dowiedzieć, co napisał Sokrat Janowicz? Фактычна, візітуючы вядомага ў свеце крынкаўскага аўтара, выпадала б гэта ведаць, а не кожны мае доступ да энцыклапедый ці іншых (шматлікіх) публікацый з біябібліяграмамі пісьменнікаў.

Не абышлося таксама без падарункаў. Маршалак уручыў пісьменніку Вазу падляшскага дастатку, якую зрабіла моладзь тэрапійнай майстэрні ў Аўгуставе. Пэўна, мае яна прыпамінаць аўтару „Wielkiego miasta Białystok", што не заўсёды яму ў сталіцы рэгіёна добра і шчасліва вялося, ды затое цяпер яму добра і шчасна. Канкрэтна, бо за абяцанкамі прагучала дэкларацыя маршалка аб фінансавай дапамозе ў выдаванні твораў спісаных пасля міжнародных літаратурных трыялогаў, арганізаваных Вілай Сакрата ды гавэндаў мастака „Pod znakami Orła i Pogoni". Значыць, візіт быў *wart świeczki*.

На маршалкоўскіх старонках у Інтэрнэце пасля візітацыі Villi Sokrates паказалася інтэрв'ю невядомага аўтара з яе заснавальнікам. Аўтар спрабаваў справакаваць шасцідзесяцісямігадовага Сакрата Яновіча да рамантычных прызнанняў. Пытаўся, вось, спаглядаючы на аўтараў агарод, прыгадваючы, пэўна, школьныя чытанні Яна Каханоўскага: „Прыгожы агарод, ды ліпы ў ім не бачым. А каб так сесці пад ліпай..." Яновіч, аднак, не Каханоўскі, а ў польскіх абавязковых чытаннях яго няма, у адрозненне ад іншых ягоных жывых калег па пяры. Так, вось, адказаў: „Ёсць яна, ды яшчэ маладая. Маю затое старую яблыню, але чаго там сядзець, камары пакусаюць". І хоць гэта зусім „прыземная" думка, то і яна, мабыць, пройдзе ў гісторыю, як цытата з вялікага майстра, вялікага не толькі па прычыне таленту і дзеянняў, але і дзякуючы дапамозе падляшскай улады, якая надумалася, мабыць, знайсці ў сабе душу мецэната.

На жаль, Сакрат Яновіч іншай сваёй думкай у час сустрэчы з высокай уладай, даў ёй агрумент для супакаення сумлення ў сувязі з марным дафінансоўваннем лакальных культурных мерапрыемстваў. Аўтар „Сцяны" так вось сцвердзіў: „Без культуры можна жыць, без культуры яшчэ ніхто не памёр, а ад недахопу хлеба — так". Спадар Сакрат, ці чуеце, як маршалак у час чарговага пасяджэння, калі размяркоўваюцца грошы на культуру рэгіёна, паўтарае вашу думку?

Мудрасць — сумотная.

Мацей Халадоўскі

Усе любілі Тамару Саланевіч

Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі (ТПНЗ) 18 ліпеня арганізавала агляд кінафільмаў Тамары Саланевіч. Як вядома, Т. Саланевіч была ўраджэнкай Нараўкі, тут закончыла пачатковую школу. Агляд быў прымеркаваны да трэцяй гадавіны яе смерці. ТПНЗ, якое фармальна існуе ад красавіка гэтага года, запрасіла тэлежурналістаў Пятра Нестаровіча і Кацярыну Паплаўскую, якія працавалі з Тамарай Саланевіч. Яны прывезлі з сабою некаторыя кінафільмы Тамары Саланевіч, між іншым, „Ці чуеш як плача зямля", „Матачнік", „Апошні дом", „Жэртва". Спецыяльна з гэтай нагоды арганізатар падрыхтаваў фотавыстаўку „Тамара Саланевіч 1938-2000".

Вечарам у нараўчанскім амфітэатры прайшоў паказ кінафільмаў Т. Саланевіч. Прысутных прывітала старшыня ТПНЗ Вольга Зданоўская-Місяюк (яна ўраджэнка Нараўкі). На мерапрыемства прыйшлі прадстаўнікі гмінных улад: войт Мікалай Павільч і старшыня Рады гміны Славамір Кулеша, парафіяльныя святары — каталіцкі і праваслаўны, члены 60-асабовага ТПНЗ, нараўчане ды жыхары навакольных вёсак Плянты, Заблотчыны, Свінароя, Ляўкова і Міклашэва.

Першы кінафільм п.з. „Тамара" быў пра Тамару Саланевіч. Зняла яго Кацярына Паплаўская. Яна з Пятром Нестаровічам падзяліліся ўспамінамі пра Тамару Саланевіч. Прыгадалі, што яе дакументальныя фільмы атрымалі высокую ацэнку вядомага польскага кінарэжысёра Кшыштафа Кеслёўскага.

Тамара Саланевіч мела сваю творчую манеру, своеасаблівую ўражлівасць. Жанчына стойкага, моцнага характару, прынцыповая, прафесіяналка ў тэлежурналістыцы. Карыстаючыся метафарай, можна сказаць, што здымала фільмы не камерай, а сэрцам. Здымала іх у вёсках распаложаных у далінах рэк Нарвы і Нараўкі ды ў Белавежскай пушчы. Паказала жыццё-быццё беларускай меншасці ў Польшчы, як ніхто раней. Яна дарыла вялікім каханнем „тутэйшых". Намагалася пранікнуць у іх душы, у іх заблытаныя лёсы. Іх боль быў яе душэўным болем.

Адзін з кінафільмаў — „А памяць жыве ў нас" — пра гаротны і цяжкі лёс сям'і Сяргея і Вольгі Казлоўскіх з Навін (Нараўчанская гміна). Каваль Сяргей і яго жонка ўжо не жывуць. Другі фільм „Ці чуеш, як плача зямля", між іншым, пра перасяленцаў з вёсак Боўтрыкі, Гарбары і іншых. Зараз на месцы гэтых колішніх пасяленняў плёшчуць хвалі Семяноўскага вадасховішча. Трэці фільм „Ускраінная балада" паказвае жыццё жыхароў вёсак ва ўсходняй паласе Беласточчыны і беларускія народныя абрады ды і ўсё яшчэ жывыя забабоны. Чацвёрты фільм, „Жэртва", пра паломніцтва праваслаўных людзей на Святую Гару Грабарку. Пяты фільм, „Апошні дом", трывожны і хвалюючы, пра жыхароў Дома для састарэлых у Ялоўцы.

Героі Тамарыных фільмаў — сапраўдныя жыхары вёсак. Яны глыбока веруючыя. Часта бачым іх у царкве, на могілках.

Янка Целушэцкі

Пятро Брысач

Расказванне міфа

Выдадзеныя нядаўна ў Бібліятэцы „Картак" *Апавяданні з-над Нарвы** Міраслава Грыкі гэта знакаміта абдуманая і свежая проза, якой не было даўно на паліцах кнігарняў. Сіла гэтай прозы — перш за ўсё ў спосабе расказу некалькіх, здавалася б, правінцыйных гісторый.

Міраслаў Грыка, родам з паднарваўскіх Рыбакоў, снуе свае аповеды аб тых, каго лёс завёў на канец свету — у Нарву, Нараўку, Рыбакі, Цісоўку, а, можа, і яшчэ далей. І напоўненай настальгіяй, цёплай мовай сваіх апавяданняў ахапіў усё: адчай і жаль, бунт і згоду, бязмежную роспач і радасць ад Месца, у якім яго героям давялося жыць. Так апісаць „выстойванне" або, калі хто хоча — звычайнае жыццё, і выявіць разнастайнасць колераў паасобных „лёсаў", удаецца толькі нешматлікім. Міраслава Грыку, несумненна, можна прылічыць да „нешматлікіх". Знакаміты літаратурны слых, а таксама майстэрская спраўнасць спрычыняюцца да таго, што *Апавяданні...* чытаем адным дыхам.

* * *

Том аповедаў Міраслава Грыкі на першы пагляд падобны на выдадзеныя пару гадоў таму *Галіцыйскія аповеды* Анджэя Стасюка. Абедзве кніжкі расказваюць аб забытых Богам краінах. У Стасюка гэта малыя, загубленыя дзесьці ў горах пасляпэгеэраўскія вёскі, у Грыкі — рассыпаныя пад беларускай мяжой гарады, мястэчкі і вёскі.

Народжаны ў 1960 годзе Стасюк напісаў *Аповесці*, калі меў на сваім рахунку некалькі агучаных кніжак. Народжаны ў 1959 годзе Грыка наднарваўскімі сваімі апавяданнямі дэбютуе. Ёсць аднак штосьці, што тыя іхныя творы адрозніваe і спрычыняецца да таго, што дэбютанцкая прапанова Міраслава Грыкі цікавейшая. Стала гэтак таму, мабыць, што *Апавяданні з-над Нарвы* даспявалі вельмі доўга, а Грыка не спяшаўся з іх выданнем.

Калі ў абодвух выпадках можна гаварыць аб літаратурнай спробе апісання „метафізікі правінцыі", то ў Стасюковай версіі накідваецца яна як сетка ўяўленняў, у якую Стасюк прабуе ўпісаць сваіх герояў. Адтуль прасякнутая філасафічнасцю мова, праз прызму якое Стасюк іх сузірае:

Каб ускараскацца на пацяроб, трэ абсунуцца ў глыбокі яр, пасля паўгадзіны — пад горку сцежкай вытаптанай у глыбокім снезе (...). Загружаныя банкамі з бензінам, піламі, сякерамі, з кішэняў тырчаць бутлі з-пад кока-колы поўныя гарбаты, з усім гэтым майданам патрэбным для працы і каб выжыць, уздымаліся ўверх быццам нейкія арктычныя мурашкі. Заўсёды будуць лезці ўверх або спускацца ўніз у даліны чарговых прамінальных каралеўстваў шукаючы руды, драўніны, камення, усіх рэчаў патрэбных, цяжкіх, бясформенных, падобных да іх саміх. Патомкі другога Ноевага сына, несвядомыя свайго радаводу, заблытаныя толькі ва ўспаміны бацькі ды дзеда — чаго вочы не ўбачаць, памяць не захавае (фрагмент апавяданя „Янак" з *Галіцыйскіх аповесцяў*).

* * *

У апавяданнях Грыкі адбываецца іншае: паказвае ён метафізіку ў руху, апісвае яе азбукай тых, якія яе ўздзеянню паддаліся. Стасюк — недзе над сваімі героямі, а Грыка — з імі. Стасюк апісвае, Грыка — услухоўваецца ў сваім нутры ў тое, чым прасякнуты ад заўсёды. Да таго ў наднарваўскіх апавяданнях больш цікавая, незвычайная мова, якая не прабуе нічога тлумачыць — яна пачутая, простая і, парадаксальна, падшытая поўнай іроніі „свойскай" філасофіяй, якая дрэмле ў Грыкавых героях:

— Ну, хлопцы, — сказаў Юзак, — бракуе мне толькі хаты.

— Як заплаціцца, так і збудуецца, — выказаў сваю сентэнцыю Янак Раз Два.

— А на рыску не ўдасца? — панура запытаўся Юзак.

— І мы ў дастатку не ходзім, пане радны.

— Ды ж вы абяцалі.

Праўда, абяцалі. Абятніцу мус здзейсніць. І збудавалі мы Юзаку, паводле прымаўкі, «як заплаціцца, так і збудуецца», фач.

* * *

Грыка ў *Апавяданнях з-над Нарвы* не ўзводзіць міфа і не міфалагізуе правінцыю. З міфам ён таксама і не дыскутуе — усяго ператварае яго на свой літаратурны лад ва ўсім ягоным узвышэнстве ды побытавасці. Міф проста расказваецца, нічога не прапускаючы з таго, што ад яго ўзнікае ва ўзноўленым *Апавяданнямі...* Месцы: *Работы іншай, чым у Мрочкі, няма ў нашым мястэчку. Не знойдзеш яе, дарэчы, ва ўсёй гміне. Паехаў бы куды — выгады няма, бо на адны білеты чалавек больш аддасць, чым заробіць. Жывем, як умеем. Жыць трэба. А калі дзеці ў цябе е, то і адказнасць вялікая, і жыць трэба яшчэ больш ахвярна, хоць бы ты думаў штовечар аб галіне і пятлі на вяроўцы. Хто жыве з успамогі, дык жыве як апошні жабрак. Хто жыве з жончынай пенсіі, той у хаце значыць усё менш. З таго ўсяго чалавек з хаты ўцякае. А калі хто паставіць мазгаёба, дык на душы лягчэй. Іншы раз сам паставіш...*

Кніжку можна набыць у кнігарні „Акцэнт" па вул. Рынак Касцюшкі, 17, у Беластоку.

* Mirosław Gryka, *Opowiadania znad Narwi*, Biblioteka Kartek, Białystok 2003, ss. 128.

Літаратурна-мастацкая старонка № 520

Юры Гумянюк

Сад дзяцінства

Маё дзяцінства ў райскім садзе —
ядвабны лісцік шмарагдовы
з кропелькамі ранішняй расы
плыву сабе па хвалях кветак
ды ўсмоктваю іх водар далікатны

сцяблiны мажныя бы мачтавыя сосны
я ж — красналюдак у калысцы травяной

раслінны свет гудзенне пчолаў
і колер неба з плямамі кефіру
далёка ўверсе і не скаштаваць
цяпер ужо пладоў тых райскіх
ружова-прамінулага дзяцінства.

На даўнім здымку

На даўнім здымку я, нібы апачы, —
ў вяночку з пёраў, ножык у руцэ.
Цяпер такога не пабачыш —
барозны зморшчак на шчацэ.

На даўнім здымку — зеляніна лета,
мой дзед пад слівай ў хустцы, як пірат,
бабуля смажыць тлустыя катлеты,
і газіроўку п'е стрыечны брат.

На даўнім здымку — верныя сабакі
ля ног пільнуюць сціплы дабрабыт,
а я павольна трушчу казінакі
ды мару, бы філосаф Гераклiт.

На даўнім здымку ў квецені і сонцы
шчаслівы момант — птушка на плячы!
Усмешка дзеда плішчыцца ў бясконцасць,
і ад дзяцінства немагчыма уцячы...

Віктар Швед

Прымітыўная аперацыя

У Гайнаўскім малым шпіталі,
На ўскраі Белавежскай пушчы,
Падчас вайны аперыравалі
Мяне Пташынскі і Ендрушчак.

Меў гнойнае я запаленне
Камеры сумежнай носа.
Я жыў у жудасным цярпенні,
Як пакараны горкім лёсам.

Звычайны малаток убачыў
І долата падрыхтавана.
Быў я тады ўжо блізкі плачу
І знерваваны нечувана.

Мне выбівалі дзірку ў косці
У верхняй сківіцы балюча.
Тады ўжо мроілася штосьці,
Пранізваў цела боль пякучы.

Потым у хаце фельчар-татка
Рабіў анучныя тампоны,
Іх прутам упіхаў з аглядкай,
Насычаныя самагонам.

І зажыло ўсё шчасна ў хаце,
Мінула страшнае цярпенне.
Я толькі два зубочкі страціў,
Якім падрэзалі карэнні.

Лукаш Шопа

Эль-Грэка і галовы

На вернісажы Грэка
я падышоў толькі да іконы
і трыпціху.
Пасля дзяцініўся і губіўся ля палотнаў
нібыта ў порціках катэдр
і блокаў-хмарачосаў.

Размову
я завёў з малым Хрысціцелем Іаанам
гамонячы хутчэй пра футру
чым пра Марыю і сына яе побач.

З цёмных палотнаў
у апошняй зале
я выбег як у парк пасля імшы
у італьянскі рэнесанс.

І тут, у яснасці вялікай,
У мутным таргавішчы, —
Іаан Хрысціцель, Галафернес —
Без зразумення і ўвагі для павабу Веранезе
і італьянкі-блёнд з запіснай кніжкай,
лавіў я позіркі ўсечаных галоў
і зрух запясцяў Іудзіф і Саломе.

Пераклала з польскай Ганна Кандрацюк

Міра Лукша

Абадуркі

Франуся Абадурку зноў не адправілі на пенсію. Наеўся ў гэты раз сырое бульбы, выпіў літар густое кавы. Перад камісіяй ледзь устаяў, ды шаноўная камісія не то што такіх штучных хворых рассакрэціць. У апошні час падымаюць на ногі адным словам ды пару подпісамі смяртэльна хворых членаў страховачных фірмаў ці цудоўна аздараўляюць бязногіх ды бязрукіх. Што там бяззубы Франак Абадурка! Хлопец харошы, выглядае, як то ў нас кажуць, здаровым — рослы ён ды румяны на твары, шчакасты. У сапраўднасці — ні то хворы, ні то здаровы. Кожнага ж хвароба дойме. Хопіць паляжаць на сырой зямлі. Дай яму яшчэ два-тры гады — сам кончыцца ў сваёй кампаніі бязжэнных вясковых кавалераў.

Пенсія прыдалася б Франусевай гаспадарцы. Было б за што з'есці ды выпіць, бо страхоўку не трэба было б плаціць. Як жылі дзед з бабай, то неяк карміліся. А цяпер, з сёстрамі Адэляй ды Маланкай, што працу страцілі ў горадзе, пару гадоў да свае пенсіі, калякаюць яксьці. Сёстры і выправілі Франуся да дактароў. А ён кажа: пайшлі б замуж. Мала то кавалераў па вёсках! Адэлька і Маланка, аднак, падзіліся на братавых кампаньёнаў, і ні адзін ім не быў даспадобы. Як які спраўдны на выгляд, дык, выпіўшы, бывае, і з нажом ці сякерай бегае наўкол крамы, суседзяў пужае. Каб хоць былі такія людскія, спагадлівыя, як сам Франусь. Калі вып'е, дык плача, сам сябе ды іншых шкадуе, а біцца не лезе. Ну, але, чакаючы брата з камісіі, сёстры падрыхтавалі прыём. Зарэзалі тры куркі, напяклі бульбянай бабкі, наварылі яек, нарэзалі гуркоў ды памідораў. А кавалеры, Франусевы калегі, прынеслі пяць бутэлек гарэлкі, купленай у Прадсядацеля з Мастоў, былога калгасніка, што возіць цяпер нетутэйшыя тавары па Беласточчыне. Будзе баль у Абадуркаў!

З аўтобуса выкаціўся ўвесь перапочаны, стомлены Франусь. Ужо па паходцы было відаць, што не прыносіць добрай весткі. Але ці вестка добрая, ці благая — і так нагода, каб выпіць ды паплакаць, ад шчасця ці ад гора, та ўжэ ж.

— Не далі! — Франусь зашаргатаў крэслам, падсоўваючы яго да стала ў летняй кухні. — Каб на іх пагібель! Дармаеды! Налівайце!..

Шасцёх хлопцаў, што пасядалі на дзвюх кульгавых канапках, узнялі свае шклянкі, хруснулі гуркамі.

Нагода сумная, ды хоць яна ёсць. Маеш да каго рот адчыніць. Да люстэрка ж піць не будзеш. Глытанулі і Абадурчанкі.

Ранкам Франусь не прачнуўся. Бачыце, калі б пенсію і прызналі, дык і так не пакарыстаўся б. Пісана ж было яму кончыцца ў сорак пяць. Як кажуць індусы, — карма такая ў чалавека, так было яму пісана.

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Адкуль мы ўзяліся?

Задумоўваюцца дзеці:
Адкуль узяліся на свеце?
Бо толькі недаразуменняў
Адносна іхняга з'яўлення.

— Бусел прынёс мяне, вядома,
Азваўся нечакана Фома, —
Кінуў у капусту, як на зман.
— Дык ты таму такі качан.

Лік адзіночны і множны

— Скажыце дзеткі без маны,
Як вырашыць нам можна,
Які вось маюць лік штаны,
Адзіночны ці множны?

— Хлусіць я цалкам не прывык,
Сказаў Ясь асцярожна:
Зверху ў іх адзіночны лік,
А знізу будзе множны.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паўлік Кулачэўскі з мамай

Алесь Гарун

У прыпар

Прыпарыла,
Нахмарыла
І ўдарыла!
— Святы Ілля...
Маланка ўраз з'явілася,
Мільгнула і звалілася,
І дожджыкам аблілася
Гарачая зямля.
Кроплі разам, згодна, жвава
Пояць усё, што хоча піць:
Збожжа, дрэвы, кветкі, травы,
Вулкі хочуць затапіць,
Б'юць у стрэхі, мыюць шыбы,
Мыюць хаты, мочаць сад,
У рэчцы спожыў маюць рыбы...
— Хто ў прыпар дажджу не рад?
Сцішаецца,
Змяншаецца,
Ўнімаецца.
— Няма!
І слонка паказалася,
Маўляў само купалася;
Прыемна ўсміхаецца,
Блішчыць, пераліваецца
На траўцы, на лісточку,
У рэчцы, у раўчачочку,
На вуліцы, у садочку,
Зямля ўздыхае поўнымі,
Шчаслівымі, чароўнымі
Грудзямі ўсіма.

Ніна Мацяш

Балотная чарапашка

Чарапашка балотная
застрайкавала:
ходзіць галодная,
хоць ежы — навалам.

На кожным ступку —
вітамін зялёны,
аднаго бабку
у балоце — загоны.

— Чарапашка, чуй,
з'еш яго хоць троху...

— Бабку не хачу,
хачу гароху!

Тэатр насычаны колерамі

Школьны тэатр з Ягуштова заўсёды вылучаўся мастацкім сцэнічным афармленнем. Так было і ў гэты раз — у час сцэнічнага агляду ў Гайнаўцы. Навучэнцы з Ягуштова паставілі добравядомую гумарэску „Несцерка". У ролі галоўнага героя выступіла Юстына Вышкоўская, якая цалкам натуральна зайграла кірмашнага махляра. У ролі яго кандыдаткі ў жонку, — малодшая сястра — Эвеліна Вышкоўская. Сёстры, як паказаў ужо не адзін тэатральны агляд, маюць тэатральны талент. Асабліва цікава іграюць яны гумарыстычныя тыпы персанажаў.

Спектакль, як ужо мы згадалі, праходзіў на фоне незвычайнага мастацкага афармлення. Краявід колішняга мястэчка прадстаўляла карціна-пейзаж. Колеры сцэны зладзіліся з маляўнічасцю касцюмаў. Тут акцёры апрануліся хутчэй па-цыганску, калярова, з фантазіяй. Стылізаванасць на народны лад выяўлялася дэталямі — спосабам вязання хусткі, вышываным фартушком, прычоскай — і гэты прыём удала пазбягаў штучнасці.

Эфект мацаваў пейзаж, размаляваны яркімі колерамі. Гэта ўжо само па сабе паглыбляла сакавітасць дыялогаў, якія ў п'есе „Несцерка" проста ашаламяльныя. Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Тэатр з Аўгустова. У ролі Нясцеркі Юстына Вышкоўская — першая злева

Вясёлы куточак

Паліцыянт спыняе самаход:

— Плаціце штраф! — паведамляе шафёра.

— За што?

— За перавышэнне хуткасці.

— У вас няма радара. Адкуль ведаеце, што я перавысіў хуткасць?

— Вы ехалі бззюмм!

— А як было трэба?

— Пыр-пыр-пыр...

Як смерць за куму

(Беларуская народная казка)

У бедных сялян паміралі дзеці. Жонка кажа мужу:

— Ідзі, папрасі ў кумы сустрэчных людзей.

Пайшоў селянін. Выйшаў за вёску, выглядае. Хто ні ідзе, хто ні едзе, муж маўчыць. Нясмелы такі быў, баяўся з людзьмі загаварыць. Вярнуўся дахаты і кажа:

— Нікога не бачыў, нікога не сустракаў.

— Ідзі, — кажа жонка, — чакай, аж кумоў зладзіш.

Пайшоў чалавек. Людзі ідуць, а ён як той слуп, стаіць і маўчыць. Аж бачыць, пані ідзе. Апранутая, багатая.

— Каго ты мужык выглядаеш? — пытае. Расказаў чалавек ёй пра сваё гора.

— Ідзі дахаты. Я прыйду і кума прывяду.

Роўна ў дванаццаць гадзін прыйшлі кумы. Узялі дзіця, ахрысцілі. Ды ўжо хрэсьбіны гуляюць.

— Ну, цяпер, — кажа пані — ваша дзіця будзе жыць. Глядзіць яна на бацькоў і папракае.

— А ў вас жыццё такое хмурнае, сумнае. Вам трэба весялей жыць.

— Як жа мне весяліцца, калі я да людзей падысці баюся, — кажа муж.

— Падыдзеш. Паслухай мяне. У вашым сяле дзяўчына на пасцелі ляжыць, дваццаць гадоў хварэе. Бяры ў мяне бутэльку, набяры вады з карыта, дзе кароў і коней паілі, і занясі хворай. Пакрапі і скажы: — Заўтра на ногі ўстанеш!

Мужык круціўся, але кума ўгаварыла:

— Як увойдзеш у хату і будзе ў нагах гарэць свечка — знай — вылячыш. Як у галаве свечка — пам-

Цвікі

Каля святліцы растуць ліпы. Ой, колькі ім гадоў будзе! Яшчэ школы мураванай не было, тысячагодкі, і гэтай драўлянай святліцы, пабудаванай грамадскім пачынам, а тыя ліпы ўжо раслі. Баба Юля казала, што і да другой сусветнай вайны ўжо яны былі немалыя, а садзіў іх яе бацька яшчэ юнаком. І на іх заўсёды віселі і вісяць розныя аб'явы. Пра выбары — вялікія плахты дробна задрукаванай паперы, пра пазыку грошай, калі трэба крэдыт, каб што купіць, пра забавы — намаляваныя каляровымі пісакамі, размазаныя каляровымі рагамі ад дажджоў, выпалавелыя на сонцы. Хоць на сцяне святліцы прыбітая адпаведная дошка, да якой можна аб'явы і паведамленні прышпіліць булаўкамі ці прыклеіць, традыцыйна людзі вешаюць іх на дрэвах. Каб толькі вешалі! Каб добра яны трымаліся, не шкуматаліся ветрам, даводзіцца прыбіваць іх і цвічкамі, а то і здаровымі цвікамі. І з кары вытыркаюцца шмат гадоў цвікі недабітыя, рудыя ад іржы, ці ўгнаныя аж па плешку ў парэпанае цела ліп, а пад імі — надарваныя шматкі паперы.

Прапаў у Зосі сабачка, Мопсік. Паплакала дзяўчынка, стала шукаць яго па ўсёй вёсцы, пытацца ў суседзяў, ці яго хто не бачыў. Дала нават аб'яву вадзіцелю аўтобуса, каб паклаў ля лобавага шкла — Мопсік вельмі любіў падарожнічаць, мог забегчы ў аўтобус на прыпынку ды паехаць нават і ў Гайнаўку або выйсці дзе па дарозе. Павесіла аб'яву з Мопсікавым партрэтам на святліцы. І, традыцыйна, спрабавала яе начапіць на старую ліпу. Два цвічкі лёгка дасталіся з кары. Падняла Зося камень, спрабавала ўбіць цвікі ў кару, каб прымацаваць сваю вестку. Тук-тук! — і ў палец! А-я-яй, як баліць! Зося зморшчылася ад болю, паклала балючы палец у рот, быццам ад таго лягчэй магло зрабіцца.

— Што, забалела? — запытаўся дзядзька Алік, што, злезшы з ровара, чытаў паведамленні. — А як ты думаеш, ліпе не баліць? Паглядзі, колькі ў яе ранаў. Колькі цвікоў у яе нахвасталі! А ты толькі раз дзюбнула сабе ў палец, і адразу „а-я-яй"!

Паглядзела Зося на пярэстае ад цвікоў і старой паперы цела старое ліпы, і слёзы яшчэ больш зашчыпалі ў яе вачах.

Міра Лукша

Польска-беларуская крыжаванка н-р 31

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 27: Мастак, замена, сава, радок, трон, панадворак, банал, сава, каса, празноз. Пара, баран, мана, медаль, анод, саква, Осла, астра, караван, пан. Узнагароды, **фотаальбомы**, выйгралі: **Марта** і **Марыёля Каліноўскія** з Беластока. Віншуем!

ўпрасілася

рэ дзяўчына. І памятай, каб грошы ўзяў!

Мужык зайшоў да хворай і зрабіў так, як кума загадала. Пакрапіў, памаўчаў, пастаяў і пайшоў.

На другі дзень дзеўка ўстала з пасцелі, валасы зачасала.

— Дайце мне есці, — кажа. Родныя бацькі апошні грош мужыку аддалі. Пасля, слава пра аздаравіцеля ў народ пайшла. А яшчэ кума загадала, каб дарма не лечыў:

— Ты, абадраны і бедны, — бяры грошы, золата, усё што даюць, каб галадранцам не лазіў!

Хутка павесялеў, ажыў мужык. Дзе прыйдзе ўсіх вадой аздараўляе. Людзі апошні грош аддаюць, чорту душу прадаюць.

Вось захварэў князь. Прыязджаюць слугі па мужыка. Той бараніўся — дзе ж у палац яму са сваёй вадой з карыта?! Але князь так загадаў і не было выхаду.

Па дарозе куму сустрэў.

— Здароў мужык! — кажа пані. — Куды ты намерыўся?

— Вось, загадалі мне князя лечыць...

— Нічога, едзь, пакрапі, вазьмі грошы і ўцякай! Я разам буду.

Мужык прыехаў у двор і бачыць — ля галавы князя свечка гарыць.

— Памрэ, — думае, — але што мне рабіць? Пакрапіў ён князя, узяў грошы і чым хутчэй з'ехаў з двара. Князь, вядома, сканаў, за „доктарам" пагоню паслалі. Дагналі мужыка, вяроўкамі павязалі. Абяцаў ён жыццё за золата вярнуць, бажыўся, што жывым будзе. Бач які шарлатан!

А побач кума стаіць, смяецца.

— Ратуй мяне кумачка! — просіць мужык — ты ж сама мяне на дурную дарогу звяла.

— Не, — кажа пані, — я спакушала цябе знарок.

І бах... галаву мужыку скасіла.

(гак)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паўліна

Найбольш дэкламатараў з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім. Сярод іх гімназісты. І чамусьці сярод выступаючых пераважаюць дзяўчаты. Відаць, у паняцці моладзі, дэкламацыя — справа дзяўчат.

Паўліна Глінка, гімназістка з „тройкі", падрыхтавала верш Алеся Гаруна „Мае думкі".

Паўліна разам з сябрамі папоўніла патрыятычны рэпертуар. Менавіта, многія гімназісты падабралі вершы пра змаганне і незалежнасць Беларусі. Алесь Гарун — паэт адраджэнскай плыні, сёлета прагучаў некалькі разоў на сцэне.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Эва

Эва Мароз ад наймалодшых гадоў прымае ўдзел у дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова". Яе выступленне заўсёды вылучаецца сярод іншых. У выкананні Эвы адчуваем культуру слова і тактоўнасць, жывую цікавасць для сказанага.

Эва Мароз — лаўрэатка другога месца ў цэнтральным конкурсе „Роднае слова".

Гайнаўская гімназістка дэкламавала верш Якуба Коласа „Два маразы". Ці не пад гук прозвішча падабрала верш гімназістка?

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Уршуля

Уршуля Ігнацюк з Нараўкі — лаўрэатка першага месца Цэнтральнага конкурсу „Роднае слова 2003".

У час выступлення нараўчанскай гімназісткі публіка суцішылася, запанавала цішыня, увага. Уля ўразіла публіку найперш эмацыянальным пераказам. Твор Караткевіча ў яе выкананні вылучаўся пачуццёвасцю і пафаснасцю.

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,

Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,

Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы

І вішнёвыя хаты глядзяць на шырокі Дняпро.

Прыведзены ўрывак — верш Уладзіміра Караткевіча „Беларуская песня". У ёй адчуваем таксама мелодыю нараўчанскага падбелавежскага краявіду.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Каміля

Калі Каміля Цітко збіралася ў першы клас пачатковай школы, „Зорка" напісала пра яе артыкул. Дзяўчынка заявіла, што будзе вывучаць беларускую мову.

Сустракаемся пасля многіх гадоў. Каміля прадстаўляе сваю школу ў конкурсе „Роднае слова".

— Ці памятаеш нашу першую сустрэчу? — пытаю гарадоцкую гімназістку.

— Памятаю, памятаю, — смяецца прыгажуня-гімназістка.

Каміля захоўвае „Зорку" са сваім дзіцячым партрэтам. З тае пары ходзіць на беларускую мову. У раённым конкурсе „Роднае слова" заваявала другое месца.

Зорка

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Хор „Родніца" (Мінск)

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

„Polskie kwiaty" (Астравецкі раён)

Беласток-Гродна 2003

Канцэрт меншасцей

20 ліпеня ў гарадскім амфітэатры ў Беластоку адбыўся XI Фестываль польскай і беларускай песні „Беласток-Гродна 2003". Арганізавалі яго Саюз палякаў Беларусі і Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы. Фестываль адбываецца наперамен: у Гродне і ў Беластоку. Мастацкія калектывы прадстаўляюць нацыянальныя меншасці ў сваіх краінах — польскую ў Беларусі і беларускую ў Польшчы.

Сёлета падчас Фестывалю можна было паслухаць не толькі фальклорныя калектывы, але і сучасныя эстрадныя. Выступілі таксама танцавальныя маладзёжныя і дзіцячыя гурты з Гродна, Ваўкавыска і Гайнаўкі.

Фестываль адкрылі старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі і прадстаўніца Саюза палякаў Беларусі Аксана Галамбоўская. Яны адзначылі неабходнасць такіх сустрэч, што яны прыбліжаюць меншасці да сябе ды вядуць да лепшага ўзаемапазнання. Я. Сычэўскі і А. Галамбоўская прывіталі гасцей, між іншым, консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандра Карачуна, прадстаўніка Міністэрства культуры Беларусі Тадэвуша Стружэцкага, старшыню Падляшскага самаўрадавага сейміка Збігнева Кшывіцкага, падляшскага куратара асветы Зофію Транцыгер-Кочук і прадстаўніцу Аддзела культуры Гарадскога ўпраўлення ў Гродне Людмілу Кадзевіч.

Канцэрт вялі Марыя Казлоўская і Арэк Якімюк. Першым выступіў хор „Крыніца" з Беластока. У яго выкананні былі дзве песні — „О, Беларусь, ты край наш вечны" ды „Там на лужку, на лужку", — якімі гурт запаланіў публіку. Добра зарэкамендавалі сябе „Цаглінкі" са Старога Ляўкова. Адметна выканалі песню „Усходзіць ясны месяц ды светлая зара". „Расспяваны Гарадок" з Гарадка прывёз з сабою песні „Добры дзень, шаноўныя людзі" ды „Ой, павяду я коніка паіць". А ўжо вялікую прыхільнасць заваявалі эстрадныя гурты „Лідэр" з Беластока (спявалі песні „Не капайце крынічэньку", „Пчолы", „За даламі вёсачка") і „Прымакі" з Гарадка („Як забава, то забава", „Дуб зялёны"). Запомніліся калектывы: „Маланка" і „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, „Лучына" з Беластока і хор Гайнаўскага дома культуры.

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Вакальная група са Струбніцкага дома культуры

Зоркай канцэрта быў народны хор „Родніца" з Мінска. Задушэўна выконваў ён песні „Шумяць вербы, што я пасадзіла", „Ой, там у садзе, садзе-садочку", „Кавалёк, кавалёк-кавалёчак" і песню пра чарнявую дзяўчыну.

Польскія песні мілагучна і з вялікім пачуццём спявалі калектывы з Гродзеншчыны, між іншым, „Вішанька" з Путрышкоўскага дома культуры, вакальная група са Струбніцкага дома культуры, „Анджэліка" з Ліды, „Шкляры" з Бярозаўкі, „Польскія кветкі" з Астравецкага раёна і „Іўянка" з Іўя.

Адным словам, было чым душу парадаваць. Канцэрт закончыўся польскай песняй „Piękna nasza Polska cała" і беларускай „Люблю наш край" у выкананні ўсіх удзельнікаў фестывалю. Людзі выходзілі з мерапрыемства пад вялікім уражаннем. У час канцэрта адбываўся кірмаш кніжак і рукадзелля народных умельцаў.

Фестываль быў увянчэннем двухдзённай (18 і 19 ліпеня) Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Шлях да ўзаемнасці".

Янка Целушэцкі

Беларускі шлях Яна Булгака

У Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы 5 ліпеня адкрылася выстаўка прац беларускіх, польскіх і літоўскіх фатографаў. Здымкі былі зроблены ў час Міжнароднага фатаграфічнага пленэру арганізаванага ў 2001 годзе беларускім шляхам Яна Булгака.

— Яна Булгака ведалі ў Польшчы і Літве. Мы вярнулі яго імя ў беларускую культуру, бо гэта было нашым абавязкам, — заявіў Аляксандр Ласмінскі, камісар выстаўкі, якая раней паказвалася толькі ў Гродне і Варшаве. — З'яўляецца ён бацькам мастацкай фатаграфіі.

Мае беларускія суразмоўцы звяртаюць увагу на беларускія карані Яна Булгака, а польскія — на яго сувязі з польскай культурай. Нарадзіўся ён у сям'і дробнай беларускай шляхты. Сваю першую фатаграфічную лабараторыю стварыў непадалёк Мінска. Пасля працаваў выкладчыкам фатаграфіі ў Віленскім універсітэце. Там заснаваў фатаграфічны клуб і прыцягнуў да яго дзейнасці маладых фатографаў. У час вайны яго негатывы — плён амаль саракагадовай працы — былі знішчаны. Выехаўшы ў Варшаву, заснаваў Саюз польскіх мастакоў фатаграфікаў.

— Ян Булгак узняў фатаграфію да мастацтва і назваў фатографаў фотаграфікамі. Любіў рабіць здымкі краявідаў і архітэктуры. Хаця я не карыстаюся непасрэдна яго вопытам, бо займаюся найчасцей рэпартажнай фатаграфіяй, то яго асоба з'яўляецца для мяне добрым узорам, — кажа ўдзельнік булгакаўскага пленэру Марэк Далецкі, мастацкія здымкі якога таксама на выстаўцы.

Побач лясных і марскіх краявідаў у музеі можна ўбачыць фатаграфіі фрагментаў беларускіх замкаў і іншую даўнюю архітэктуру. Удзельнікі пленэру фатаграфавалі ў Міры, Нясвіжы і іншых гістарычных месцах. Гайнаўскага фатографа Славаміра Куліка цікавіць рэпартажны здымак, на якім відаць цягнікі і мужчын, што канчаюць араць поле. Няроўна заранае імі поле стала тэмай мастацкай працы. Некаторыя фатаграфіі чорна-белыя. Веслаў Турна з Кельцаў накладае на здымкі чорна-белую эмульсію і таму яны больш каштоўныя за іншыя. Удзельнікі мерапрыемства затрымліваюцца каля фатаграфій Віктара Волкава. Віктар Кабац асобу Яна Булгака лічыць памостам паміж польскай і беларускай фатаграфіяй і культурай.

На адкрыцці выстаўкі прысутныя былі пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандр Карачун і старшыня Гарадской рады ў Гайнаўцы Якуб Астапчук. Выстаўка фатаграфій у беларускім музеі — другое мерапрыемства, якое арганізуецца па дамоўленасці паміж паслом Рэспублікі Беларусь у Польшчы Паўлам Латушкам і старшынёю Грамадскага камітэта пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры Янам Хіліманюком. Прадбачвае яна ў гайнаўскім музеі чарговыя мерапрыемствы.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Выстаўку адкрывалі (злева) пасол Павел Латушка, фатограф з Гродна Аляксандр Ласмінскі, консул РБ у Беластоку Аляксандр Карачун, фатограф з Беластока Марэк Далецкі і старшыня Камітэта пабудовы музея Ян Хіліманюк

За ідэалы ў будучыні

У Маладзечне наведваем магілу Міколы Ермаловіча. Разам з намі Міхась Казлоўскі, рэдактар краязнаўча-літаратурнага часопіса „Куфэрак".

— Я меў шчасце асабіста ведаць Ермаловічаў, — кажа Казлоўскі. Разам з гісторыкам пахаваная яго жонка, Лідзія Цімафееўна. На схіле гадоў, калі гісторык страціў зрок, Лідзію Цімафееўну называлі яго „вачыма".

— Яны былі святлом, маральным аўтарытэтам, — адзначае наш маладзечанскі гід. — Пасля іхняй смерці мы адчулі страшэнную пустэчу. Ніхто іх не заступіць!

Міколы Ермаловіча не стала 5 сакавіка 2000 года, загінуў ён пад коламі машыны на 79 годзе жыцця.

Зараз беларуская інтэлігенцыя ў Маладзечне вядзе старанні, каб на будынку, у якім жыў гісторык, павесіць беларускамоўную шыльду.

— Але ўлады не даюць дазволу, — адзначае Міхась Казлоўскі.

* * *

У 1921 годзе, калі нарадзіўся Мікола Ермаловіч, Янка Купала пераклаў на сучасную беларускую мову старажытны помнік рускай літаратуры „Слова аб паходзе Ігаравым". Цікавая сувязь — у „Старажытнай Беларусі" Ермаловіч прыводзіць арыгінальную інтэрпрэтацыю гэтага старажытнага помніка. Адсюль чэрпае інспірацыю і натхненне для вывучэння сівой мінуўшчыны. Асабліва часта карыстаецца „Словам" для характарыстыкі легендарнага Усяслава Чарадзея. Нават уступ да згаданага гістарычнага даследавання, пачынае радкамі Купалы народжанымі ў Акопах:

Пачнём збіраць зярно к зярняці,
Былое у думках ўваскрашаць,
Каб быт на новы лад пачаці,
І сеўбу новую пачаць.

Несумненна Ермаловічу належыцца самая багатая сяўба на гістарычным грунце XX стагоддзя. Пакончыў ён са знішчальным для Беларусі міфам пра заваёў Вялікага княства Літоўскага літоўскімі феадаламі:

— Усе гэтыя гістарычныя байкі, — піша пра „літоўскі заваёў" у гістарычным нарысе „Па слядах аднаго міфа" — атрымалі ў гістарычнай навуцы шырокае распаўсюджанне і трывала замацаваліся ў ёй, дзякуючы польскаму гісторыку Мацею Стрыйкоўскаму. Стрыйкоўскі напісаў „Хроніку" на аснове летапісаў XVI стагоддзя, і выдаў яе ў Каралеўцы дзякуючы дапамозе жамойцкага біскупа Гедройца. Усё гэта было ў інтарэсе жамойцкіх феадалаў, ідэолагам якіх і з'яўляўся Гедройц.

* * *

— У барацьбе за праўдзівую гісторыю Бацькаўшчыны праявіў сапраўдны волатаўскі дух, быў паслядоўны і бескампрамісны, — піша пра Ермаловіча гісторык Анатоль Грыцкевіч. — Ён не пабаяўся пагрозы і з боку адпаведных органаў, дзе яму няраз прапанавалі спыніць „свае пісанні". „Жаль что я тебя тогда не знал", — сказаў яму адзін з супрацоўнікаў тых органаў, пашкадаваўшы, што цяпер не 1937 год.

У 1988 і 1989 гг. часопіс „Маладосць" друкуе „Старажытную Беларусь". Самастойнасць мыслення аўтара, крытычнае стаўленне да прадстаўнікоў афіцыйнай гістарычнай навукі, арыгінальныя высновы, падмацаваныя сістэмай доказаў, параўнанне фактаў з розных летапісаў і замежных хронік далі чытачу новую канцэпцыю старажытнай Беларусі.

Публікацыі Ермаловіча ішлі да чытача пакутлівым шляхам. Каб надрукаваць „Па слядах аднаго міфа", аўтар чакаў дваццаць гадоў. Апублікаваныя фрагменты ў адным з рэдкіх акадэмічных выданняў пра археалогію адразу

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міхась Казлоўскі, Лена Глагоўская і Вечаслаў Харужы ля магілы М. і Л. Ермаловічаў

і сустрэлі адпор з боку кансерватыўных гісторыкаў. Яны нават прапанавалі звярнуцца ў ЦК КПБ з афіцыйным лістом, каб забараніць Ермаловічу друкаваць свае творы. Нягледзячы на гэта гісторык, жывучы ў Маладзечне, больш за два дзесяткі гадоў ездзіў у Мінск, прыходзіў у беларускі аддзел Дзяржаўнай бібліятэкі БССР і працаваў над сваёй кнігай. Яму ніхто не плаціў за гэта, яму толькі перашкаджалі.

* * *

Мікола Ермаловіч нарадзіўся 29.04.1921 года ў вёсцы Малыя Навасёлкі Койданаўскага раёна ў сялянскай сям'і.

Да вайны закончыў тры курсы Мінскага педагагічнага інстытута. У 1941-1943 гг. працаваў настаўнікам у Мардоўскай АССР, пасля настаўнічаў на Віцебшчыне і ў Дзяржынску. Пасля вайны абнавіў вучобу ў педінстытуце, затым залічаны ў аспірантуру. З 1948 па 1955 год працаваў выкладчыкам беларускай літаратуры ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце, а пасля яго закрыцця быў загадчыкам метадычнага кабінета Маладзечанскага абласнога інстытута дасканалення настаўнікаў. У канцы пяцідзесятых, па стане здароўя, выйшаў на пенсію.

У літаратурным жыцці з'явіўся ў 1948 годзе як аўтар крытычна-літаратурных і гістарычных нарысаў. У 1970 годзе выйшла кніга „Дарагое беларусам імя", праз дзевятнаццаць гадоў — „Па слядах аднаго міфа" і ў 1990 г. — „Старажытная Беларусь".

— Народ павінен ведаць сваю гісторыю, — пісаў у апошнім выданні. — Але не на тое, каб паўтараць, бо паўтарэнне гісторыі, нават самай бліскучай, азначае, што народ гэты не мае ўжо ідэалаў у будучым, што ён бачыць іх толькі ў мінулым, а гэта раўназначна яго пагібелі. Гісторыя, хаця звернутая ў мінулае, яна даследваецца ў імя будучыні. Народ, які не ведае сваёй мінуўшчыны, не варты і будучыні.

Доследы маладзечанскага гісторыка адкрываюць новыя перспектывы нашчадкам, пад іх уплывам нараджаецца прага пазнаваць мінулае Бацькаўшчыны.

Ганна Кандрацюк

Крыніцы: М. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь*, *Па слядах аднаго міфа.*

Манастыр з катакомбамі

Супрасльскія радныя вырашылі неадплатна перадаць Дабравешчанскаму манастыру ўчастак з катакомбамі. Праваслаўнай царкве шэсць гадоў таму быў вернуты манастырскі комплекс, але без катакомбаў. Увесь гэты час вяліся намаганні па вяртанні манаскай некраполіі, якая складае неад'емную частку манастыра.

Крыху гісторыі

Катакомбы — падземныя грабніцы — у раннім хрысціянстве выкарыстоўваліся для правядзення рэлігійных абрадаў, пазней служылі месцам пахаванняў і будаваліся пад храмамі і могільнікавымі збудаваннямі. Традыцыя будавання асобных храмаў з падзямеллямі для хавання памерлых характэрная ўсходняму хрысціянству. У Супрасльскім манастыры, заснаваным у 1498 г., манахаў сталі хаваць у падземных грабніцах каля паловы XVI стагоддзя. Абшырныя катакомбы для двухсот пакойнікаў былі ўзведзены пад Уваскрэсенскай царквой, якая будавалася ў 1532-1557 гадах пры праваслаўным архімандрыце Міхале Кімбары. У іх апрача манахаў пакояцца таксама прадстаўнікі Алелькавічаў, Слуцкіх, Вішнявецкіх і іншых вядомых у І Рэчы Паспалітай шляхецкіх родаў і знатных мяшчан. Катакомбы былі спалучаны падземным пераходам з Дабравешчанскай царквой, у крыптах якой пахаваны былі заснавальнікі і кцітары манастыра. Супрасльская лаўра больш за стагоддзе належала праваслаўным. Пасля Брэсцкай уніі (1596 г.), у пачатку XVII стагоддзя манастыр перанялі уніяты і таксама ў катакомбах сталі хаваць базыльянаў.

У другой палове XIX стагоддзя у катакомбах памерлых ужо не хавалі. Зруйнаваную Уваскрэсенскую царкву разабралі, а катакомбы прыкрылі. Стагоддзе пазней зацікавіліся імі археолагі. Адкрытыя і незабяспечаныя катакомбы пачалі разбурацца, а да таго часта ставаліся яны ахвярай вандалаў.

Вяртанне манастырскай маёмасці

Супрасльская лаўра, якая ў праваслаўе вярнулася ў 1839 г., пратрывала ў ім да І сусветнай вайны. У ІІ Рэчы Паспалітай не было ўжо ўмоў для аднаўлення манаскага жыцця. У Супрасль праваслаўныя манахі вярнуліся толькі ў 1984 г. Тады аднаўлены быў Дабравешчанскі манастыр і пачалася рэканструкцыя ўзарванага гітлераўцамі ў 1944 г. сабора. Дэмакратычныя перамены пасля 1989 г. стварылі магчымасці ўрэгулявання юрыдычнага статусу Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Прыняты ў 1991 г. парламентам закон аб адносінах дзяржавы да ПАПЦ рэгуляваў таксама маёмасныя пытанні, што дазволіла хадайнічаць аб вяртанні храмаў і маёмасці забраных уладамі дзесяцігоддзямі раней. Аднак гэты працэс не ішоў бесперабойна. Пасля шматгадовай валакіты (на манастырскія будынкі прэтэндавалі яшчэ уніяцкі Ордэн базыльянаў, Каталіцкі касцёл і нашчадкі супрасльскіх фабрыкантаў Захертаў) манастырскі комплекс перададзены быў Дабравешчанскаму манастыру толькі ў 1996 годзе, але без катакомбаў, распаложаных па другі бок дарогі ў манастыр.

Паніхіда ля плота

Манахі ўвесь час апекаваліся знішчанымі катакомбамі. Гэта яны збіралі выкінутыя косці і хавалі іх на манастырскім дзядзінцы, здзяйснялі паніхіды ля зруйнаванай грабніцы, якая з 1997 года стала гміннай уласнасцю. Намаганні манахаў атрымаць ад мясцовай адміністрацыі ўчастак з катакомбамі не далі станоўчага выніку. Два гады пазней ініцыятыву добраўпарадкавання катакомбаў пераняла мясцовая каталіцкая парафія Святой Тройцы. Падтрымалі яе Ордэн базыльянаў з Варшавы і бурмістр мястэчка. У 2000 г. катакомбы былі абгароджаны, а на ўваходнай фортцы з'явіўся салідны замок. 9 жніўня, напярэдадні свята Супрасльскай іконы Божай Маці манахі з дзвюма тысячамі паломнікаў маліліся за душы пакойных манахаў ля агароджы. У 2001 г. мясцовая адміністрацыя распрацавала план добраўпарадкавання катакомбаў і ўзвядзення на іх па прапанове Каталіцкага касцёла экуменічнай капліцы. Супрасльскія манахі не згадзіліся з такімі планамі і апелявалі ў вышэйшыя інстанцыі — Самаўрадавую апеляцыйную калегію, Міністэрства ўнутраных спраў, упаўнаважанага па правах чалавека, генеральнага рэстаўратара помнікаў даўніны, даказваючы, што катакомбы гэта інтэгральная частка манастыра. Лакальныя ўлады далей прытрымоўваліся сваёй пазіцыі і пакінулі ўчастак з катакомбамі ў сваім распараджэнні.

Без энтузіязму

Адмаўляючыся перадаць катакомбы праваслаўным бурмістр спасылаўся на адмоўныя рэакцыі жыхароў Супрасля і Каталіцкага касцёла. Аднак катакомбы ахоўваюцца законам аб могільніках і ахове памерлых, таму без згоды рэлігійнай абшчыны, да якой калісьці яны належалі, нельга распрацоўваць новыя планы добраўпарадкавання гэтай тэрыторыі. Відаць, гэта пераканала частку радных (6 дэпутатаў галасавала „за", 5 — „супраць", а 4 — устрымаліся ад голасу) аб перадачы манаскай некраполіі яе законным уладальнікам. Трэба мець надзею, што ваявода ў парадку юрыдычнага нагляду не адхіліць пастановы супрасльскіх радных і такім чынам шчасліва завершыцца шматгадовая валакіта вакол вяртання маёмасці Супрасльскаму манастыру.

Віталь Луба

Жыў паэт з сумнай душою

Беларускі часопіс „Шлях моладзі" ў ліпені-жніўні 1933 года пісаў: „Дваццаць чацвёртага чэрвеня гэтага году, седзячы над берагам Нёмана, каля роднае вёскі Мінявічы Луненскай гміны Гарадзенскага павета, выстралам з рэвальверу перарваў сабе жыццё малады беларускі паэт Міхась Явар (Карась).

Родная сястра паэта, відаць, прадчуваючы нешта кепскае, сачыла за братам і калі пабачыла, што ён хоча сабе адабраць жыццё, хацела яму ў гэтым перашкодзіць, але было ўжо запозна, бо скіраваны ў грудзі рэвальвер выстраліў. І хоць куля ў сэрца не папала, то аднак прычынілася да таго, што 27 чэрвеня Міхась Явар сканаў у Горадні, куды перавезены быў на лекі.

Міхась Явар з'яўляўся нашым сталым супрацоўнікам. Ягоныя творы былі друкаваны на бачынах „Шляху моладзі".

Паходзіў Міхась Явар з небагатае беларускае сялянскае сям'і. Ён глыбока перажываў сучасныя падзеі і цяжкае палажэнне беларускага народу. Здароўе меў слабое і доўга хварэў на сухоты. Апошнім жа часам папаў ён у цяжкія жыццёвыя абставіны. Усё гэта так забойча дзеіла на ягоную маладую душу, што нервы больш не маглі вытрымаць".

З той трагічнай смерці паэта прайшло роўна 70 гадоў. І 100 гадоў з дня яго нараджэння. Менавіта гэтыя дзве даты нядаўна адзначыла творчая інтэлігенцыя Мастоўшчыны. Ушанаванне адбылося ў вёсцы Лунна Мастоўскага раёна. Адна з вуліц гэтай вялікай вёскі з 1991 года пачала насіць імя Міхася Явара, а на мясцовых могілках знаходзіцца магіла паэта. На магіле ўстаноўлены помнік з граніту, які вырабіў і ўсталяваў мастоўскі майстар Вячаслаў Халько.

На магілу Міхася Явара яго землякі ўсклалі кветкі, а пасля тут адбыўся мітынг памяці. Яго адкрыў заслужаны работнік культуры Беларусі дырэктар Гудзевіцкага літаратурна-этнаграфічнага музея Алесь Белакоз. Алесь Мікалаевіч шмат гадоў збіраў літаратурную спадчыну свайго земляка, таму яго расказ пра Міхася Явара ўсіх вельмі зацікавіў: „Нарадзіўся паэт Міхась Явар у 1903 годзе. Дзяцінства прайшло ў роднай вёсцы Мінявічы Мастоўскага раёна, а з 1915 года ён быў у бежанстве. Там і адчуў юнак вялікі сум па родным Нёмане, па багатых беларускіх лясах, па нашых палях-паласяках. Пачуццё выключнасці родных Мінявічаў не пакідала Міхася Явара праз усё жыццё. Калі вярнуліся з бежанства, не было за што рук зачапіць. Зямлі мала, а сям'я вялікая: маці, малодшы брат Васіль і сёстры Люба і Вольга. Міхась пачаў рыбачыць на Нёмане. Хлопец ён быў вельмі спрытны і працавіты. Ведаў рыбныя месцы, вывучыў рыбныя сакрэты, іх паводзіны ў розныя поры года і ў рознае надвор'е. Рыбы ён лавіў шмат і прадаваў яе гандлярам ды службоўцам з мястэчка Лунна. А яшчэ Міхась Явар быў вельмі акуратным, заўсёды сціпла, але ахайна апранутым, паголеным і чыстым. Хоць меў невялікую адукацыю (тры класы), але многія лічылі яго інтэлігентам. І ён ім быў: вёў вялікую асветна-патрыятычную дзейнасць, пісаў вершы, якія друкаваліся на старонках часопіса „Шлях моладзі", у заходнебеларускіх газетах, арганізоўваў вечары з пастаноўкамі п'ес, з песнямі і танцамі, нават сам цудоўна спяваў. Асаблівую актыўнасць Міхась Явар выявіў у грамадоўскія дваццатыя гады, калі быў сябрам БСРГ".

Алесь Белакоз расказаў таксама аб тым, што ў Гудзевіцкім музеі ў 1968 годзе быў створаны куток, які знаёміць наведвальнікаў з трагічным лёсам паэта-земляка. „За асабістыя грошы ўдалося заказаць у скульптара Станіслава Быка два бюсты Міхася Явара: адзін быў ахвяраваны для Луненскага музея, а другі ўстаноўлены ў нашым Гудзевіцкім музеі, — працягваў свой аповед

На магіле Міхася Явара выступае Алесь Белакоз

Алесь Мікалаевіч. — Гэта выклікала незадавальненне ў тагачаснага партыйнага кіраўніцтва. Была наладжана татальная праверка працы Гудзевіцкай сярэдняй школы і кожнага яе працаўніка. У праверцы прымалі ўдзел інспектары і загадчык раённага аддзела адукацыі, райкамаў партыі і камсамола, дырэктары школ і іншыя асобы. Толькі з дапамогай беларускіх пісьменнікаў удалося ў музеі захаваць бюст Міхася Явара".

З Лунна сённяшнія землякі Міхася Явара паехалі ў яго родную вёску Мінявічы, дзе яшчэ захавалася хата паэта. Уяўляеце, гэтай хаце больш за сто гадоў. Ды і сама вёска знаходзіцца ў маляўнічым месцы на крутым беразе Нёмана. Найпрыгажэйшае месца на Мастоўшчыне. Не любіць такую вёску і не быць паэтам проста немагчыма. Дарэчы, летам там часта жыла польская пісьменніца Эліза Ажэшка (1841-1910). У лютым 1887 года яна пісала Яну Карловічу: „Тры тыдні таму назад быў у мяне ваш добры знаёмы з Вільні пан Багушэвіч. Вельмі прыемна правяла з ім некалькі гадзін. Ён чытаў мне свае беларускія творы і нават даў мне іх копіі з асобным вершыкам, таксама напісаным для мяне па-беларуску. Будучым летам паспрабую чытаць іх маім мінявіцкім знаёмым". Добра было б, каб сёння ў хаце Міхася Явара зрабіць літаратурны музей. Хата ж незвычайная, яна як і сама вёска Мінявічы, мае непасрэднае значэнне ў гісторыі беларускай і польскай літаратур.

Што датычыць паэтычнай спадчыны Міхася Явара, дык яна амаль не захавалася. Перад смерцю куфэрак са сваімі вершамі, паэмамі і пісьмамі паэт занёс свайму сябру Вінцуку Мікулу. Калі пачалася вайна, Мікулу шукалі немцы. Жонка яго, баючыся, каб немцы не выявілі вершаў Міхася Явара, усе архівы знішчыла. Засталося толькі тое, што было апублікавана ў заходнебеларускім друку. У 1990 годзе Уладзімір Калеснік, які называў паэта „з чулай сумнай душою" адзін верш „Паклон чалавечаму страданню" ўключыў у анталогію „Ростані волі". Сапраўды, Міхась Явар найбольш пісаў пра сумнае, асабліва туга і роспач скразною лініяй праходзяць праз ягоныя паэмы „Шляхам цярністым", „Думы ў адзіноце" і „За сэрцам".

Самота адчуваецца і ў вершах паэта, прысвечаных роднай прыродзе, асабліва Нёману. Але Нёман заўсёды быў і застаўся надзейным сябрам паэта, які да апошніх дзён яму ніколі не здрадзіў:

О, мой Нёман мілы,
О, мой Нёман родны,
Толькі ты застаўся верным
У маім жыцці, у маім каханні,
У маім штодзённым цяжкім страданні.
Ты не пакрыўдзіў мяне,
Ты мне ніколі не здрадзіў,
Як здрадзілі людзі...

Побач з вёскаю Мінявічы на беразе Нёмана сёння ляжыць вялікі каменьвалун. На сціплым 100-гадовым ушанаванні паэта было вырашана выбіць на камені два словы „Міхась Явар". Няхай Нёман, якога любіў паэт з Мастоўшчыны, сваімі хвалямі чытае гэтае імя.

Сяргей Чыгрын

Саветы паказвалі фільмы

Успаміны Яна ХМЯЛЕЎСКАГА, народжанага ў 1926 годзе ў Паўднёвым Востраве.

У міжваенны перыяд былі ў нашай вёсцы падпольшчыкі, галоўным чынам маладыя. Прыязджаў да іх Прытыцкі і штось рабіў. Аднаго з нашых вяскоўцаў загналі ў арышт у Шудзялава, але не пасадзілі. Ён быў з багацейшай сям'і і паліцыянт сказаў яму:

— Каму-каму камуна патрэбная, але не табе.

У 1939 годзе, калі пачалася нямецка-польская вайна, з нашай вёскі мабілізавалі коней у Крынкі, Лешчаную і Куроўшчыну. Коней ацэньваў афіцэр і калі слабыя былі, то не бралі. А за забраных заплацілі новымі грашыма; заплацілі таксама тым, што тых коней загналі.

Немцы да нашай вёскі не даехалі. Даехалі ў Крынкі маторамі, але зараз адступілі.

Саветаў віталі ў Крынках, жыды і нашыя кветкі ім кідалі. Калі савецкая калона праходзіла праз нашу вёску на захад, то адзін наш вясковец іх вітаў; было гэта тады, калі бульбу выбіралі.

Савецкае войска спынілася на некалькі дзён каля нашай вёскі. На адну стадолу палатно начапілі і фільмы паказвалі — уся вёска хадзіла глядзець. Пасля тое войска адышло.

Саветы нікога не вывезлі, але даваенныя падпольшчыкі сабраліся і напалі на надлясніцтва. Надлеснаму ўдалося ўцячы, але яны забілі ягоную жонку і трое дзяцей. І ў Паўночным Востраве дваіх забілі; адзін з іх быў да вайны солтысам і, мабыць, даносіў на падпольшчыкаў паліцаям. Пасля саветы двух тых, якія стралялі да ахвяр, кудысь вывезлі і яны ўжо не вярнуліся. Саветы сказалі, што ёсць *власць*, якая разглядае правіны, а самасудаў рабіць нельга. А ўсіх тых, якія памагалі ў забойствах, не чапалі.

Сельсавет быў у Грыбоўшчыне, у вялікай хаце пры царкве; царкву паставіў Ілья Клімовіч, а хату парафія пабудавала. Старшынёй сельсавета выбралі Налівайку з Новай Грыбоўшчыны; яго пасля немцы забілі. А міліцыянер пры сельсавеце быў з Вярхлеса — яго ў 1946 годзе банда забіла.

Пры саветах *дысцыпліна* вялікая была. Мусова было лес рубаць і для высечкі адусюль людзей прыганялі. Зімою 1940 года, якая была вельмі лютая, у нашай хаце начавала дзевяць чалавек. А куды той лес вазілі: ці немцу, ці ў Расію — невядома.

Хацелі ў нас арганізаваць калгас, але не ўспелі. А ў Лешчаной, Гаркавічах і Слоі зрабілі.

Калі ў 1941 годзе немец напаў на саветаў, тыя адступалі, а немцы з самалётаў стралялі і білі іх. Калі ішла нямецкая часць, спынілася яна на уніяцкіх могілках — расклалі там агонь і спявалі свае песні.

Немцы злавілі дзевяць савецкіх салдат, якія апынуліся ў нашай вёсцы. І аднаго нашага вяскоўца, які дагала, як салдаты, абстрыжаны быў, разам з імі зачынілі ў свіронку. Адзін стары стаў прасіць, каб тутэйшага адпусцілі і немцы яго звольнілі. А тым савецкім хлопцам выкапалі за вёскай яму і ўсіх пад вечар расстралялі. Адзін з іх кінуўся ўцякаць, але яго гналі страляючы і застрэлілі. Бадай пасля вайны астанкі тых салдат выкапалі і кудысь вывезлі.

Нямецкія жандары стаялі ў Крынках і Шудзялаве; сярод іх былі і нашы людзі.

Хадзілі савецкія партызаны, прыходзілі з Перацёсаў пад Валіламі. Бывалі і ў нашай вёсцы харчы або лахманы ўзяць. У Крушынянах і Азяранах было двух такіх, якім немцы далі ружжо, каб партызанаў у вёскі не пускалі. То некалькіх партызан перапранулася ў нямецкую форму і тым двум загадалі фурманкі даць. А пасля падвялі іх пад лес і расстралялі. А самі ўцяклі.

Яшчэ ў Новым Востраве была школа, у якой немцы былі. І з вёскі траіх да сябе ўзялі, каб ад партызанаў пільнавалі. І ў Нетупе гэтаксама было. Але тыя ахоўнікі з партызанамі не біліся, толькі калі немцы адступілі, тады партызаны спалілі тыя „казармы".

Людзі крыху ведалі, што на вайне тварылася. Ведалі пра акружэнне немцаў пад Сталінградам і пра аблогу Ленінграда. А калі шашой у Валілах стала нямецкае войска назад ехаць, тады вядома ўжо было, што немец адступае.

Немец апіраўся. Нашу вёску немцы заставілі платамі і паклалі міны. Але як ішлі саветы, то іх людзі папярэдзілі і яны размінавалі. Немец з нашай вёскі кароў забіраў, як адступаў. І людзей, каб тых кароў гналі.

Вёска наша не гарэла: ні ў 1941, ні ў 1944 годзе. Адно толькі калі наступалі саветы, іх снарад трапіў у адну хату і толькі яна згарэла.

Пасля вайны тут банды хадзілі, але нічога такога не зрабілі; калі б хто ўдаў, то пабілі б. Забралі ў нас коней, заехалі ў лес і тых коней пусцілі і коні вярнуліся да гаспадароў. А ў Крынках тых, што арганізавалі новую ўладу, пабілі.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Сенакос у Студзіводах

У „Паэтычным сенакосе” арганізаваным 28 чэрвеня 2003 года ў Студзіводах прынялі ўдзел народныя творцы. Сярод іх былі беларускія народныя паэткі Вольга Анацік і Марыя Манаховіч з Ягуштова. Свае мастацкія працы прэзентаваў Анатоль Краўчук з Крывой. Арганізатары мерапрыемства — Ваяводскі асяродак анімацыі культуры і Бельскі дом культуры, наладзілі яго на прыродзе. Побач Музея малой айчыны зрабілі капіцу сена і паставілі каля яе граблі — неадлучныя атрыбуты сапраўдных сенакосаў. Нават дождж не спыніў паэтычнага сенакосу. Седзячы пад адкрытым небам удзельнікі мерапрыемства і мясцовыя жыхары заслухалі дэкламацыі твораў народных паэтаў.

Мерапрыемства распачалося з экскурсіі шляхам мяшчанскай пісанкі. Народныя паэты разам з Дарафеем Фіёнікам наведалі Ягуштова, Стрыкі, Шасталы, Грабавец і Лубін-Касцельны, якія раней лічыліся мяшчанскімі пасёлкамі Бельска. Пісанкі, якія выконваюцца ў гэтых населеных пунктах, розняцца ад пісанак з навакольных вёсак.

У Студзіводах удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з выстаўкай пісанак. Пасля дэкламатары з тэатральнай групы „Антракт” чыталі вершы мясцовых паэтаў: Надзеі Артымовіч, Яна Чыквіна, Юркі Баены, Зосі Сачко, Ежы Плютовіча і Марылі Базылюк. Народныя паэты прадставілі свае навейшыя творы. Марыя Манаховіч зачытала вершы на беларускай літаратурнай мове, а Вольга Анацік — на мясцовай гаворцы. Намеснік дырэктара ВААК у Беластоку Барбара Пахольская паясніла, што народную творчасць вызначыць цяжка. Яна — выяўленне эмоцый. Часта творцы адклікаюцца ў ёй да вартасцей закранутых у народных павер’ях. Каардынатар мерапрыемства, кіраўнік аддзялення мастацкай адукацыі БДК Яніна Плютовіч старалася, каб у час мерапрыемства зберагалася вясковая атмасфера.

На тэрыторыях, якія зараз уваходзяць у склад Падляшскага ваяводства, сустрэчы народных паэтаў арганізуюцца ад 20 гадоў. У мінулым вясковыя паэты спатыкаліся тры разы ў год. Вясной арганізаваны былі „растопы”, летам — „сенакос”, а восенню — „прымаразкі”. Прыязджалі на іх, у галоўным, старэйшыя жыхары вёсак і мястэчак. Сярод народных творцаў многа земляробаў. Ёсць настаўнікі, пісьманосцы і бізнесмены. У выдаванні зборнікаў іх творчасці дапамагае ВААК.

— „Сенакос” з’яўляецца цікавым мерапрыемствам, якое гуртуе мясцовае асяроддзе. Людзі, якія заходзілі да нас, маглі ўбачыць, што такія як і яны вяскоўцы могуць пісаць вершы і выдаваць зборнікі. Пераканаліся, што літаратурная творчасць не з’яўляецца дзіўным заняткам, — заявіла інструктар БДК Альжбета Фіёнік.

Аляксей Мароз

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Рэпчыцкі авечкавод

Рыгор Янушэк з Рэпчычаў вядомы ў Кляшчэлеўскай гміне авечкавод, з’яўляецца членам Саюза авечкаводаў. Яго статак, гэта дваццаць пародзістых авечак і столькі ж маладняку.

Гадоўля нерэнтабельная, — скардзіцца суразмоўца. На скупцы за воўну па 2 зл/кг плацяць, за бараніну 4 зл., ягнячыну — 7 зл. Шкуры гандляры купляюць па 10 зл. за штуку. Калі я маю воўну за 2 зл. прадаваць, дык лепш загату навокал хаты зраблю. Цяпло будзе, а то зараз мяшкі з воўнай гарышча завальваюць. За добрую авечку можна каля 150 зл. атрымаць. Ягнячыну найлепш перад Вялікаднем прадаваць. Рэстараны ахвотна купляюць. Бараніна на рынку ў жніўні бясцэнная, бо найбольш тады мяса. У продажы тавару авечкаводам дапамагае Саюз авечкаводаў. Невядома, што нас чакае, калі ў Еўрасаюзе апынемся. Пэўна статак ліквідаваць прыйдзецца. Няма дзе авечак пасвіць. Раней над рэчкай дзень „стаўклося”. Зараз вадасховішча тут знаходзіцца. Траву засеялі. Пашы было б удосталь, але гміна забараніла ёю карыстацца.

Набліжаўся вечар, статак вярнуўся з пашы. За авечкамі з сумам на твары ішоў авечкавод. Такое вось жыццё маладога селяніна — без перспектыў, без шанцу на лепшую будучыню.

Уладзімір Сідарук

Інвестыцыі ў Мілейчыцкай гміне

Мілейчыцкія самаўрадавыя ўлады намераны перш-наперш рамантаваць дарогі і будаваць водаправод там, дзе яшчэ яго няма. У першую чаргу адрамантуюць адрэзак дарогі з Харашчэва ў прысёлак Харашчэва і 1000-метровы адрэзак гміннай дарогі з Мілейчыч у Ялтушчыкі. На аднаўленне гмінных дарог прадназначылі звыш 300 тысяч злотых.

З сёлетняга гміннага бюджэту амаль 800 тысяч злотых пойдзе на пабудову водаправода. Ваду з крана атрымаюць жыхары Навасёлкаў, Мікуліч, Рагачоў, Мядзвежыкаў, Баравікоў ды Левашоў.

Зараз рамантуюць адзін з будынкаў у Мілейчычах на святліцу для вучняў. Тут яны будуць праводзіць свой свабодны пасля ўрокаў час. Прыстасаванне будынка на святліцу будзе каштаваць 100 тысяч злотых. Пачатковую школу ў Мілейчычах ужо аднавілі.

(яц)

Успамін аб вярбе

Гасцінец, што прабягае за вёскай Рыбакі ў напрамку былой вёскі Рудня, цяпер канчаецца на берагу Семяноўскага вадасховішча, якое пад сваёй паверхняй скрывае згаданую і іншыя вёскі. Пры гасцінцы калісь красавалася амаль стогадовая вярба. З правага боку дарогі цягнулася ўраджайнае поле, якое звалі „Глінкамі”. Рыбацкія земляробы збіралі тут духмянае жыта ці каласістую залатую пшаніцу, а ў спякотныя дні хаваліся ў цяньку раскідзістай тады вярбы. У засені вярбовай лістоты жняцы сілкаваліся, адпачывалі.

Вярба была таксама месцам спатканняў моладзі, прыстанішчам для закаханых. Пад вярбой не адзін юнак прысягаў вернасць сваёй любай. Прыпамінаецца мне, як з сябрамі збіраліся мы пажартавць з руднянскімі красунямі, сказаць ім некалькі ласкавых слоў.

Аднак усё на гэтым свеце з гадамі мяняецца. На скроні лягла сівізна. Маладосць прайшла незаўважна і ўступілі мы ў сталыя гады. Няўмольны час не абышоў бокам вярбу. Ад густой кароны засталіся засохлыя галінкі і толькі тоўсты камель адміраючай вярбы сведчыць аб колішняй магутнасці і прыгажосці дрэва.

В. Б.

Сямятычы

Горад укладае ў інфраструктуру

Самаўрад горада Сямятычы вялікую ўвагу прысвячае сістэматычнаму развіццю тэхнічнай інфраструктуры. Цяпер мадэрнізуе гарадскую ачышчальню сцёкаў. Кошт мадэрнізацыі — 9 252 тысячы злотых.

Зараз пачалі пабудову кальца па вуліцы Гродзенскай ды пракладку тратуарных плітак, між іншым, па вуліцы Тадэвуша Касцюшкі. Сёлета будуць яшчэ рамантаваць вуліцы Монтэ-Касіна і Яна Паўла II ды тратуары па вуліцах Марыі Канапніцкай, Баляслава Пруса і Фрыдэрыка Шапэна.

У будучыні плануюць разбудоўваць каналізацыйную сістэму горада пры краёвым шляху н-р 19.

(яц)

Сямятыцкаму ПСС — 95

Усеагульны кааператыў спажыўцоў „Сполэм” (ПСС) у Сямятычах гэта не толькі гандлёвая фірма, але і сур’ёзны вытворца. Між іншым, пякарня ПСС выпускае высакаякасныя хлебабулачныя вырабы і пірожнае.

Апрача таго ў ПСС у горадзе адзінаццаць прадуктовых крамаў, сем прамысловых, у тым ліку мэблевая і жалезная, з адзеннем ды з прадметамі хатняга ўжытку. ПСС таксама займаецца аптовым гандлем.

Кааператыў „Сполэм” у Сямятычах узнік у 1908 годзе. Першую сваю краму адкрыў у 1909 годзе, а на працягу наступных пяці гадоў узнікла іх 15. ПСС быў адным з большых кааператываў у Польшчы.

У 1977 годзе кааператыў спажыўцоў „Сполэм” пабудаваў вялікі гандлёвы павільён, а год пазней — рэстаран „Аленька”. Зараз ва ўсіх крамах камфартабельна. Працуюць кандыцыянеры. Пры гандлёвым кааператыўным павільёне і суперсаме па вуліцы 11 Лістапада пабудавалі стаянкі для аўтамабіляў.

Цяпер у сямятыцкай ПСС працуе 130 чалавек. У кааператыве 380 правадзейных членаў. У ПСС свая рамонтная брыгада і транспарт.

(яц)

Гайнаўка

Дзіцячы пленэр

У ліпені г.г. праходзіў XI Дзіцячы пластычны пленэр у Асяродку ўзораў для інвалідаў у Гайнаўцы. Удзельнічала ў ім 36 дзяцей. Яны ахвотна знаёміліся з рознымі пластычнымі тэхнікамі, рысавалі, ляпілі звяркоў з гліны, выконвалі лінарыты.

З дзеткамі займаліся кіраўнічка Асяродка ўзораў Яніна Язерская ды дзве студэнткі беластоцкага Політэхнічнага інстытута Уршуля Літвінчук і Магдаліна Суліма. Апрача заняткаў усе дзеці — з фізічнымі заганамі і здаровыя — разам добра бавіліся. Некаторыя з іх праводзяць тут канікулы ўжо пяты год.

(яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

— Дзе працуе твой бацька? — пытае настаўніца Янку.

— У прастытуцыі.

— Як так можаш гаварыць?!

— Вось так, бо калі рана выходзіць на працу, заўсёды паўтарае „Зноў іду ў той бардэль”, а мама яму адказвае „Каб табе тыя ... хаця прыстойна плацілі!”

* * *

Андрэй вяртаецца на досвітку дадому, у дзвярах сустракае яго жонка:

— Дзе быў?!

— На сходзе.

— Не хлусі, праўду кажы!

— Ну, добра: быў у бардэлі...

— Калі так, дык усё ў парадку, а то я ўжо пабойвалася, што такія расходы нам непасільныя.

* * *

— Чаму Коля, які працуе цэлы год, не возьме сабе водпуск?

— А ці ты калі бачыў каня ў водпуску?

* * *

— Хто гэта свіння?

— Гэта дзік, які шляхам сужыцця з чалавекам стаў свіннёю.

* * *

Прыходзіць мужчына да лекара:

— П-п-п-пан д-д-д-доктар! З-з-з-заікваюся ш-ш-шмат г-г-г-гадоў. П-п-п-прашу д-д-д-дапамогу!

Урач агледзеў мужчыну і кажа:

— Ваш чэляс такі вялікі, што празмерна абцяжарвае голасавыя звязкі і ад гэтага іканне.

— Й-й-й-які з г-г-гэтага в-в-выхад?

— Магу перашчапіць вам меншы чэляс.

Хворы згадзіўся і ў месяц пасля аперацыі ўсвядоміў, што гаворыць плаўна, аднак яго сямейнае жыццё разладзілася — расчараваная жонка закрыла перад ім усе дзверы ў спальню. Мужчына зноў пайшоў да ўрача.

— Пан доктар, не заікваюся, але што мне ад гэтага, калі жонка мяне цураецца. Перашчапіце назад мой чэляс!

— Б-б-б-баюся, ш-ш-што г-г-г-гэта н-н-н-немагчыма.

* * *

— Чаму госці прычыняюць табе двайную прыемнасць?

— Бо першы раз мне прыемна, калі яны прыходзяць, а другі раз — калі адыходзяць.

Адгаданка

			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм.

1. падзея або частка драматычнага твора = 9 __ 10 __ 17 __ 11 __;
2. форма ветлівага звароту да грамадзяніна Польшчы = 4 __ 14 __ 13 __;
3. матэматычны знак, які абазначае складанне = 1 __ 7 __ 8 __ 15 __;
4. агучаная весялосць, радасць = 3 __ 12 __ 5 __ 18 __;
5. грубы, нахабны чалавек = 6 __ 2 __ 16 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 24 нумара

Дыму без агню не бывае.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Усё прыдасца

Рашыў я, пакуль Агаты няма дома, зрабіць ёй неспадзеўку і прыхарашыць хату. Перш за ўсё, даўно ўжо трэба было ў нас памяняць у блёку вокны. Усенькія мяняюць „сталярку”, праз пару гадоў кааператыў вяртае крыху грошай, а ў гэтым годзе яшчэ можна рамонтныя паслугі і матэрыял адлічыць ад падатку. Крыху грошай у мяне завялося з ашчаднасці (крыху мо ад скупасці; аказалася, што і есці мне не хочацца, то і гатаваць на адну асобу дурная справа, і няма для каго апранацца...), тое-сёе прыслала мне мая жонка, дык, думаю, зраблю парадак у хаце і не трэба будзе заклейваць акон на зіму. Бо калі тая Агата вернецца? Калі не вернецца пад зімку, дык хто мяне будзе грэць? Батарэі? Сучка Гарэшка? Гарэшка грэе ў ногі, а тут і сэрца цяпла хоча... Ну, не буду больш пра тое, бо, як засумую за Агаткай, дык...

Паведаміў я спачатку праўленне кааператыва, што намерыўся мяняць вокны. Прыслалі камісію, праверыць. Пакруцілі насамі: не так ужо і кепска вокны выглядаюць... Пэўна, паўгода таму пачысціў, падклеіў ды памаляваў у тры слоі мне іх белай фарбай Арташ, мой знаёмы армянін. Хлопец умее рамонт рабіць, а калі сябрам робіць, дык стараецца яшчэ больш. Вокны сталі як новыя. Але, кажу шаноўнай камісіі, калі дождж ідзе ў наш бок, дык забівае пад вокны, і ваду ў хаце маем. Гатовы былі рабіць сімуляцыю, але, калі члену камісіі палец пралез пад акном на другі бок блёка, пагадзіліся, што рамонт рабіць можна. Але вяртаць грошы будуць недзе ў 2006 годзе. Каб ты дажыў, Вандал, каб *спулдзельня* з табою чымсьці падзялілася! Хутчэй дасць яна ўзнагароду свайму ганароваму старшыні на паловy акон ва ўсім нашым блёку! Дамовіліся мы з фірмай ды з Колем, Збышкам ды МакХоладам, калі будзе ўсё мяняцца. Пазваніў я яшчэ і Піятру, які ў сваёй газеце вядзе рубрыку „Твой дом”, ва ўсіх такіх штуках разбіраецца. Хлопцы — дзеля таго, каб выдзертыя вокны вынесці пад сметніцу. Ды не трэба было з усім тым насіцца — фірма вывалакла зашклёныя рамы, звезла ліфтам, паставіла пад плотам. Увалілі вокны ды балконныя дзверы ў сцены, папсікалі мантажнай пенкай, якая пуката павылазіла па баках, умацавалі, дацiснулі, падпісалі, узялі грошы...

— Ну, то барыш піць будзем, — уцешыўся хуткасцю справы МакХолад.

— Не, мы на працы не п’ем! — працаўнікі фірмы паціснулі мне руку і пайшлі.

— А мы не на службе, — адзначыў МакХолад і сеў разам з Колем ды Збышкам за стол.

— Панове, трэба штосьці зрабіць з тымі рамамі, што на падворку стаяць, — звярнуў увагу Піятро. — Маглі б вы, Вандал, выкарыстаць іх на сваім участку, зрабіць цяплічку... Пані Агата была б вельмі рада.

— Ага, усё прыдасца. Там і падваконнікі добрыя...

Ды што спяшацца! Адкаркаваў я бутэльку, паставіў закусь. Гэта ж такая абноўка хаты, так ці не, вокны на свет абноўлены! А што будзе, як аддзяру тыя порхаўкі пены, павешу заслоны!

Памылі хлопцы рукі, выпілі, закусілі. А такая спёка! Зараз і халадок павеяў, як морак на зямлю зышоў. Калі мы праводзілі адзін аднаго па сваіх хатах, ля сметніцы ўжо цяплічкі маёй Агаты не было. Ні рам, ні шыб, ні дошак ад падваконнікаў... Усё камусьці прыдалося!

Вандал Арлянскі

Правакацыя „Лясной заранкі”

Пад раніцу, перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва хтосьці застукаў у бярлогу мядзведзя Сандара Жоржавіча. Сандар расплюшчыў слепакі і не ведаў — толькі яму здавалася, ці фактычна хтосьці непакоіў яго ў такі час. Грукат паўтарыўся. Злосны мядзведзь падняўся, пашлэпаў да дзвярэй. За імі, аднак, нікога не было.

— Ну, што такое, на лесуна?! — забурчаў ад злосці.

Ужо меў вярнуцца ў ложа, калі ў вочы кінуўся яму скрутак бярозавай кары. Падняў яго. Зачыніў дзверы. Прысеў ля ложа. Разгарнуў запісаную вядомымі яму літарамі бяросту ды не ведаў адкуль. Наверсе віднела: „Лясная заранка”. А знізу тры партрэты: змяі Ссапіі, вужа Ззянона і дзіка Свіналыча, у апошні час выгнанніка. Сандар Жоржавіч прачытаў: „Пад раніцу, перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва хтосьці застукаў у бярлогу мядзведзя Сандара Жоржавіча. Сандар расплюшчыў слепакі і не ведаў — толькі яму здавалася, ці фактычна хтосьці непакоіў яго ў такі час...” Мядзведзь адчуў неспакой.

— Адкуль я гэта ведаю? — ягоныя вочы з трывогай прабеглі па літарах. Спрабаваў супакоіцца. Але трывога ўзмацнялася з кожным прачытаным словам. Сціснуў кару ў лапах і працягваў: „Грукат паўтарыўся. Злосны мядзведзь падняўся, пашлэпаў да дзвярэй. За імі, аднак, нікога не было. «Ну, што такое, на лесуна?!» — забурчаў ад злосці”.

— Хопіць! Што за кпіны?! — кінуў урэшце бяросту ў кут бярлогі, трэснуў дзвярыма і ў падскоках папёр на паляну. Яшчэ было зарана. Жоржавіч напнуўся на задніх лапах і ўзвыў, зусім быццам воўк Нятупін у час суворага зімовага голаду. Члены кіраўніцтва з’явіліся на паляну маланкава, зусім, даруйце, як гіены да падлы. Сплюшка лань Гаўрусіха выпруцілася на задніх ножках, вытрэшчыўшыся, быццам у гэтую ноч зусім і не спала, чакаючы сходу. А членка-вавёрка Кацюша не магла супакоіцца і безупынна церла пярэднімі лапкамі свае вочы.

— Канцэнтрацыя мае мне тут быць! — зароў мядзведзь. — Не дазволю справакавацца.

— Ды мы не выспаліся! — спрабавала тлумачыць вавёрка.

— Дурная ты. Справа ў кары. Не будуць мне сюды кару падкідваць. Даю забарону карыстацца ў лесе бярозавай карой.

— А як гэта так?.. — адважыўся запытацца барсук Барушчук, які замяніў у кіраўніцтве дзіка Свіналыча.

— А так гэта ды так, растаго. Баста! Канец. Пайшлі па ўзлесках!

Кіраўніцтва разышлося. Крышку супакоены Сандар Жоржавіч вярнуўся ў сваю бярлогу. Падняў з кута ранішнюю бяросту. Чытаў да канца: „Крышку супакоены Сандар Жоржавіч вярнуўся ў сваю бярлогу. Падняў з кута ранішнюю бяросту. Чытаў да канца: «Крышку супакоены Сандар Жоржавіч...»”

Праз хвіліну ў лесе чулі ўсе, як мядзведзь роў, быццам той воўк Нятупін у час суворага зімовага голаду.

МакХолад

ISSN 0546-1960